НАША НІВА

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у панядзелкі. №17 (138) 2 ЖНІЎНЯ 1999г.

ЛЕДЗЬ НЕ ЗГАРЭЛА ВЁСКА ГРЫБКІ

Фота IREX-Promedia

На здымку: пажар на ўскрайку Ельску. За першую палову гэтага году ў лясах краіны адбылося 215 пажараў, на плошчы 170 гектараў, а таксама 130 пажараў на тарфяніках на плошчы 50 гектараў. Згарэла 102 хаты, тысячы тонаў сена. За апошні месяц, ліпень, загінула 6 чалавек.

Незвычайная сьпякота, што вісіць над Беларусяй ужо другі месяц, сталася прычынай шматлікіх лясных пажараў. Так, днямі ледзьве не згарэла вёска Грыбкі, што на Мядзельшчыне. Здарылася гэта так: чалавеку, што вёз сена, закарцела закурыць. Іскра трапіла ў воз, і сухое сена пыхнула, як порах. Бядак ледзьве пасьпеў выпрагчы каня — у лічаныя імгненьні ад воза засталіся толькі жалезныя восі. Моцны вецер перакінуў полымя на траву, ад якой заняўся лес. Агонь дакаціўся да недалёкае вёскі і нарабіў вялікага сполаху — людзі пачалі нават выносіць рэчы з хатаў. На шчасьце, Грыбкі ўдалося адратаваць, аднак няма гарантыі, што іншым разам таксама пашанцуе.

Большасьць пажараў вынікае празь людзкое нядбайства й неасьцярожнасьць, таму людзям — асабліва такой сухатой, як зараз — трэба акуратна сябе паводзіць з агнём ды пільней сачыць за дзецьмі, каб ня здарылася, ня дай Бог, ніякае бяды.

Наш спэц. кар. у Крывічах Андрэй Скурко

У ЛІДЭРА НАЦЫІ ЁСЬЦЬ КАНКУРЭНТ

VI зьезд БНФ, які прайшоў 31 ліпеня — 1 жніўня ў Менску, чарговы раз абвергнуў пашыраны стэрэатып, што ў Беларусі няма вартых увагі палітыкаў. Беспрэцэдэнтная канкурэнцыя Зянону Пазьняку на выбарах старшыні БНФ з боку Вінцука Вячоркі, хоць і скончылася нічыёй 0:0, сьведчыць пра тое, што зусім хутка на беларускай палітычнай лаўцы адбудуцца істотныя зьмены.

VI зьезд праходзіў пад знакам верагоднага расколу Фронту. Пра гэта пісала прэса, над гэтым, трэба думаць, працавалі і спэцслужбы рэжыму. Ад расколу засьцярог БНФ у сваім прывітальным слове Васіль Быкаў. Між тым, на зьезьдзе не выглядала, што раскол — гэта першае, што непакоіць фронтаўцаў. Відавочны застой, паразы і памылкі апошніх гадоў прывялі да фактычнага развалу кіраўніцтва Фронту яшчэ да зьезду, і зьезд мусіў гэта нейкім чынам пераварыць.

Культ безальтэрнатыўнасьці Зяноңа Пазьняка на пасадзе старшыні нават пры тым, што сам ён тры гады жыве ў эміграцыі, стварыўся і падтрымліваўся апошнім часам ім самым. Ён уводзіў у кіраўніцтва БНФ «сваіх» стаўленікаў, якія ніяк не спрацоўваліся са старой гвардыяй, а ўрэшце прапанаваў вывесьці з Сойму БНФ тых, хто некалі і стварыў гэты Фронт разам зь ім — в/а старшыні Лявона Баршчэўскага, намесьнікаў старшыні Юр'я Хадыку і Вінцука Вячорку ды іншых. Арганізацыя мусіла перайсьці ў рукі спадароў Папкова, Беленькага, Крыварота. Гэткім чынам у БНФ стварылася дваеўладзьдзе: жывыя намесьнікі старшыні і група ягоных стаўленікаў, кіраваная з-за мяжы. Да зьезду месца разлому паміж першымі і другімі настолькі «нагрэлася», яны настолькі парознаму бачылі сытуацыю і настолькі супярэчлівыя прымалі рашэньні, што болей трываць не выпадала. Старая гвардыя прапанавала пагаджальны сцэнар пры зьмене рэальнага кіраўніка Фронту. Пазьняк заявіў, што не пацерпіць калектыўнага кіраваньня і ўказаў сваім паплечнікам на дзьверы, тым самым зрабіўшы іх сваімі канкурэнтамі. З гэткімі настроямі і пачаўся чарговы зьезд.

Трэба сказаць, што харызма Пазьняка і сытуацыя ў Фронце жыва нагадваюць сытуацыю ў краіне і харызму іншага незаменнага чалавека. Харызма патрабуе безагаворачнага падпарадкаваньня і асабістай адданасьці. Але яна не патрабуе самастойна мысьліць і адказваць, шукаць і прымаць рашэньні, — наадварот. У гэтым сэнсе Пазьняк — нібы процілегласьць ад Лукашэнкі. Прыбяры першага, і загайдаецца другі. Прападзе нацыжэньне ў зьбялелых вачах. Канфлікт мэтафарычна можна было пабачыць у першыя гады перабудовы ў Беларусі, калі пачалося вяртаньне бажніцаў і калі на вузкай сьцяжыне сыходзіліся праваслаўныя ды каталіцкія вернікі з роўнымі прэтэнзіямі на адзін храм... У выступоўцаў на зьезьдзе БНФ параўнаньне адданасьці Пазьняку з рэлігійным пачуцьцём гучала ня раз.

Працяг на старонцы 2.

Фота Уладзімера Шапака

СКРАДЗЕНЫЯ СКАРБЫ

Адзігітрыя Полацкая (Эфэская), XII ст., абраз, які належаў Сьвятой Эўфрасіньні. Зьвезеная зь Беларусі пад час Лівонскае вайны, захоўваецца ў Рускім музэі ў Пецярбургу.

Культурныя каштоўнасьці зьяўляюцца ўнівэрсальнымі — але далёка не раўнацэннымі нават для тэрытарыяльна і гістарычна блізкіх этнасаў. Так, для адных нечакана знойдзены рукапіс можа стацца нацыянальнай сьвятыняй, штуршком да пачатку адраджэньня (як тое было ў Чэхіі нават са сфальсыфікаванымі дакумэнтамі), для іншых — застацца «цікавай штуковінай», якая захоўваецца толькі з прычыны яе надзвычайнае старажытнасьці або ў адпаведнасьці з шырокавядомым прынцыпам «каб было». Гэта тычыцца ня толькі калекцыянэраў-прыватнікаў, але часам цэлых краінаў. Ёсьць, калі хочаце, краіны-калекцыянэры — былыя (і не зусім былыя) мэтраполіі, якія «зьбіралі» культурныя здабыткі калёніяў, зыходзячы зь перакананьня, што толькі цэнтар мае права на культурнае дамінаваньне, пакідаючы пэрыфэрыі толькі каменныя сякеры (самыя грубыя) ды лубачны фальклёр.

Канстытуцыйны Суд Расеі зацьвердзіў пастанову, згодна зь якой культурныя здабыткі іншых народаў, што воляй лёсу апынуліся ў Расеі, павінны быць перададзеныя краінам, якія маюць на іх права. На што ў такой сытуацыі можам спадзявацца мы? Гэтыя пытаньні мы задалі заснавальніку Скарынаўскага цэнтру Адаму Мальдзісу, начальніку групы, што працуе над навуковай сэрыяй «Вяртаньне», у якой зьбіраюцца зьвесткі пра знаходжаньне беларускіх культурных каштоўнасьцяў па-за межамі краіны.

«НН»: Спадару Адаме, як Вы ацэньваеце пастанову КСРФ пра рэстытуцыю культурных каштоўнасьцяў?

Адам Мальдзіс: Гэта слушнае і пэрспэктыўнае рашэньне, яно абнадзейвае беларускую грамадзкасьць, што з часам удасца вярнуць хаця б тое, што было вывезена ў 1939—45 г., а таксама тое, што пасьля вайны вярталася зь Нямеччыны, але прайшло празь Беларусь транзытам і абсела ў расейскіх архівах і музэях.

Працяг на старонцы 6.

Зь Беларусі за суботу й нядзелю

Лукашэнкаў «Форд» раструшчыў машыну

29 ліпеня Лукашэнкаў картэж, вяртаючыся з Горадні, папаў у аварыю. Бранявы «Форд» з Лукашэнкавага картэжу (спэцыяльна ўмацаваны для такіх сутыкненьняў) разрэзаў надвое машыну, што абганяла з сустрэчнай паласы; і кіроўца, і пасажыр гэтай машыны загінулі на месцы. А Лукашэнка як знаў — вяртаўся з жніва верталётам.

Няміга: суд будзе

Бацькі Машы Іньковай і Алеўціны Навакоўскай, дзяўчат, што загінулі ў цісканіне на Нямізе, зьвярнуліся ў суд Маскоўскага раёну Менску з зыскамі аб нанясеньні маральнае шкоды. Дзень суду вызначаць сёньня — дырэктар райсуду адмаўляецца прадставіць для разгляду справы залю, матывуючы тым, што ёсьць пільнейшыя працэсы і заля ўвесь час занятая. Наўзамен прапанавана бацькам разгледзець зыскі закрыта ў кабінэце. Але тымчасам да гэтых справаў могуць далучыцца і зыскі іншых свайкоў, чые дзеці сталі ахвярамі таго здарэньня — зь Менску, Маладэчна, Бабруйску і Сьветлагорску. Бацькі гатовыя перанесьці разгляд справы, каб ўсё адбылося па-людзку і суд быў адкрытым. Іх падтрымлівае ў гэтым праваабарончы камітэт «Вясна-96».

Статкевіч у астрозе

31 ліпеня прэс-служба Грамады паведаміла, што супраць ейнага лідэра Міколы Статкевіча ўзбудзілі крымінальную справу ў Менскай пракуратуры. Вядзе яе сьледчы Коранеў, а абвінавачваюць Статкевіча ў арганізацыі групавых беспарадкаў. Самога Статкевіча цяпер трымаюць у спэцпрыёмніку-распрэдзяліцелі ГУУС ад 27 ліпеня, калі Статкевіч узначаліў незалежніцкую дэманстрацыю. Тады судзьдзя Шэйко засудзіла Статкевіча на 10 дзён турмы. Паводле закону нельга чалавека за адно два разы судзіць — дзе ж у рашэньні пракуратуры праўда? Пра тыя падзеі чытайце таксама на с.4.

Фота IREX-Promedia

Статкевіча бяруць 27 ліпеня.

Сьмерць не перабірае й не мінае

За паўгады на Віцебшчыне загінула аж 1115 чалавек, падлічыла агенцтва «КонтурINFO». Злодзеі забілі 186, на дарогах разьбіліся 60, у пажарах згарэлі 85, патанулі 130, ад атручвання на той сьвет пайшлі 178 чалавек, у тым ліку ад атрутнай гарэлкі — 134. З-за неасьцярожнасьці на працы ў дрэва ляглі шасьцёра. Самі зрабілі сабе сьмерць 310 крывічоў. У Віцебску заўчасу сьмерць забрала 197, у Наваполацку — 83, у Воршы — 76, у Полацку — 60 жыцьцяў. Хай Бог сьцеражэ!

лісты у рэдакцыю

Сьвята Незалежнасьці ў Валміеры

Угодкі абвяшчэньня незалежнасьці Беларусі былі адсьвяткаваныя ў латыскім месьце Валміеры. Ад 26 ліпеня да 15 жніўня тут праходзіць Балтыйская летняя школа, зладжаная мясцовым універсытэтам. У ёй навучаюцца студэнты з Швэцыі, Аўстрыі, Аўстраліі, Бэльгіі, ЗША, Фінляндыі, Даніі, Нарвэгіі, а гэтаксама з Польшчы, Украіны й шасьцёра — зь Беларусі. Беларуская тэматыка сталася асноўнаю ў гэтыя дні ў Валміеры, бо падзеі ў нашай краіне для большасьці ці незразумелыя ці невядомыя. Эўрапейская моладзь зь вялікім зацікаўленьнем ставіцца да інфармацыі пра Беларусь, таму сьвята беларускае Незалежнасьці было прыемнаю нечаканасьцю й добраю нагодаю раскрыць вочы замежнікам на terra incognita ў цэнтры Эўропы.

27 ліпеня перад будынкам Балтыйскае летняе школы быў узьняты беларускі нацыянальны сьцяг, а ўвечары зладжаная сьвяточная імпрэза зь беларускімі нацыянальнымі стравамі й сьпевамі. Перад пачаткам party госьці зь вялікім узрушаньнем слухалі, як прадстаўнікі нашае краіны сьпявалі беларускі нацыянальны гімн «Пагоня». Найбольшы сьлед пакінуў падарунак вялікае швэдзкае групы — яны прэзэнтавалі бел-чырвона-белыя ружы й шчыра выказаліся з падтрыманьнем беларусаў у іхным імкненьні да свабоды.

Віктар Мухін, Валміера

***

Такое ўражаньне, што нацыянальных сьвятаў як такіх у беларусаў амаль няма. Вядома, ёсьць шмат датаў, якія мы адзначаем (Дзень Волі, Дзень Незалежнасьці, Слуцкі Збройны Чын, Дзень Бітвы пад Воршай і інш.). Але часта гэтыя даты — нагода для палітычнай акцыі. Кажуць ня «Сёньня сьвята», а «сёньня мітынг». Людзі прыходзяць на мітынг, але рэдка пачуеш адзін ад аднаго: «Віншую!» Мала хто ходзіць на дэманстрацыі з шарыкамі ці музыкай. Ды што я пра дэманстрацыі? Трэба замаўляць музычныя віншаваньні знаёмых са сьвятам (калі немагчыма ўказаць назву сьвята, дык можна хаця б дату — знаёмы зразумее). Гэты дзень, урэшце, можна адзначаць у кампаніі за сьвяточным сталом.

Добра, што 80-годзьдзе БНР было з шарыкамі і нечым падобным на сьвяточны аркестар, нядаўні дзень Незалежнасьці — з гармонікам ды скокамі. Але такое здараецца рэдка.

Віталь Станішэўскі, Менск

дзе варта быць

Фота IREX-Promedia

За гады незалежнасьці Менск стаў самым нефутбольным горадам краіны. Забітыя трыбуны, ажыятаж у пошуках лішняга білета, пасьляматчавыя дэманстрацыі фанатаў — усё гэта можна назіраць у Мазыры, Лідзе, Бабруйску, Барысаве, але не ў сталіцы. Настальгія па савецкім чэмпіянаце дорага каштавала некалі грознаму клюбу. Ні беларускіх мэдалёў, ні посьпехаў у зоне УЕФА ім сёлета, бадай, ня сьвеціць. Але ці няма й долі нашай віны ў сёньняшнім становішчы дынамаўцаў? І падтрымаць менчукоў ніколі ня позна. 8 ЖНІЎНЯ на стадыёне «Дынама» а 19-й гадзіне пачнецца **МАТЧ «ДЫНАМА» МЕНСК — «ДНЯПРО» МАГІЛЁЎ.** Дуэль паміж колішнім чэмпіёнам СССР і сёньняшнім чэмпіёнам Беларусі абяцае быць напружанаю й відовішчнай.

Калі вы любіце Менск, вам будзе цікава наведаць **ФОТАВЫСТАВУ «МОЙ ГОРАД»**, якая працягваецца ў выставачнай залі Музэю сучаснага выяўленчага мастацтва (праспэкт Скарыны, 47). Ледзь ня ўсе беларускія фотамастакі, якія ў розныя часы й сэзоны адбівалі каханы горад на стужках, прэзэнтуюць свае лепшыя працы. Мы можам пановаму зірнуць на знаёмыя кварталы сваёй сталіцы. Выстава працуе **ШТОДНЯ АД 10-Й ДА 18-Й** гадзіны. Выходныя нядзеля ды панядзелак.

У ЛІДЭРА НАЦЫІ ЁСЬЦЬ КАНКУРЭНТ

Працяг са старонкі 1.

І, нібы хочучы падтрымаць гэткае ўражаньне, прыхільнікі старшыні Фронту разьвешалі паўсюль транспаранты «Пазьняк часова ў эміграцыі, але заўсёды — лідэр нацыі». Мой знаёмы літаратар пажартаваў: словы «часова» і «заўсёды» тут можна было б памяняць месцамі. Надта ж не стасуюцца мэты багомленьня лідэра, які б ён ні быў, з патрэбаю грамадзкага руху пашыраць сваю дзейнасьць у цяперашніх умовах.

Чыста вонкава і электарат Пазьняка на зьезьдзе Фронту нагадваў электарат Лукашэнкі ў жыцьці. Прычым такое параўнаньне не закранае канкрэтнае ідэалёгіі. У Літве мне даводзілася назіраць на мітынгу прыхільнікаў кампартыі і СССР, а сьледам за імі — мітынг так званых «вязаных барэтаў» — прыхільнікаў Саюдзіса. І тыя, і тыя нібы шукалі вачыма свайго «бацьку» і гатовыя былі раздушыць любога, хто быў супраць. Гэтыя людзі, як правіла, застаюцца з сваім сымбалем веры да канца, так і ня ўмеючы прыжыцца ў зьмененым часе. Што да астатніх, якія прагнуць жыць і працаваць творча, дасягаць рэальных здабыткаў, дык іхнае расчараваньне ў «бацьку» бывае тым мацнейшым, чым больш доўгім і моцным было зачараваньне. На VI зьезьдзе БНФ заля рашуча падзялілася надвое. Пад час выступу прафэсара Хадыкі можна было пачуць з залі гістэрычнае «Ганьба!», а пад час выступу прафэсара Крукоўскага штосьці зьедлівае выкрыкваў ужо другі бок.

Сутнасна раскол апісваўся ў выступах розным бачаньнем тактычных мэтаў і розным уяўленьнем пра стыль працы ды вобраз Фронту. Прыхільнікі Пазьняка згадвалі пра будучую верасьнёўскую анэксію Беларусі і пра тое, што коней на пераправе не мяняюць. «Дык ён жа за мяжой», — заўважыў я. «Ну і што, — адказаў мне дзядзька ў гадах, — генэралу і ня трэба быць на перадавой, там мы.»

Вячорка і ягоныя прыхільнікі выступілі за пераадоленьне сэктанцтва ў Фронце, за вяртаньне руху прывабнага вобразу, за Фронт масавы, багаты, адукаваны, адкрыты да кантактаў зь іншымі арганізацыямі. Недзяржаўны сэктар, свабодныя прафсаюзы, праваабарончы рух — вось тры кіты, гатовыя ўжо сёньня скласьці базу для стварэньня такога шырокага Фронту. Кожнай радзе — нармальны офіс з аргтэхнікай і сродкамі сувязі. Адкрытасьць для СМІ, шырокія міжнародныя кантакты. Безумоўна, і вулічная барацьба. Гаварылі пра Фронт XXI стагодзьдзя, намякалі на тое, што ўяўленьні Пазьняка больш адпаведныя стагодзьдзю XIX-му. Можна было б з гэтым паспрачацца, маючы на ўвазе тую сапраўды рэальную анэксію і верагоднасьць чарговага антырасейскага паўстаньня ў духу паўстаньняў мінулага стагодзьдзя або Слуцкага збройнага чыну, калі б Пазьняк прапанаваў хоць нешта канкрэтнае рабіць у такім рамантычным рэчышчы і калі б тыя, хто падтрымлівае яго, хоць крыху выглядалі на паўстанцаў, гатовых «пайсьці ў лясы».

Але замест гэтага Зянон Пазьняк прапанаваў кворумам тых людзей, што запісаліся ў грамадзянства БНР, выбраць Грамадзянскі парлямэнт і правесьці збор подпісаў за адстаўку Лукашэнкі.

Вячорка з таварышамі запярэчылі — ёсьць прызнаны ў сьвеце Вярхоўны Савет 13-га скліканьня, чыю дзейнасьць можна і трэба напоўніць рэальным зьместам. Акрамя гэтага, менш за год засталося да выбараў новага парлямэнту. Фронт з дапамогай міжнародных інстытуцыяў мусіць дабіцца, каб гэтыя выбары былі справядлівымі і адпавядалі міжнародным стандартам, узяць у іх самы актыўны ўдзел і такім чынам прыйсьці да ўлады.

Заўважу, што агульная энэргія зьезду напачатку расчаравала. Даклад Пазьняка выглядаў кампіляцыяй ягоных ранейшых артыкулаў. Нішто не абяцала агульнага разумовага штурму, так чаканага ў нашыя замутнёныя часы. Становішча зьмянілася ў часе галасаваньня пра парадак выбараў: каго раней выбіраць — старшыню ці Сойм. Зьявілася ўражаньне, што людзі, іхныя душы паступова выходзяць зь летаргічнага сну і што ўдасца пачуць штосьці новае і абяцальнае. І калі страсьці разагрэліся набела, усе гульцы дасталі свае апошнія казыры — у каго яны, вядома, былі. Усяго на пасаду старшыні былі вылучаныя сямёра: Лявон Баршчэўскі, Вінцук Вячорка, Віктар Івашкевіч, Зянон Пазьняк, Вячаслаў Сіўчык, Юры Хадыка і Аляксей Шыдлоўскі. Апроч Пазьняка, усе астатнія зьнялі кандыдатуры на карысьць Вячоркі. Прычым выступы кожнага былі сапраўды вартыя ўвагі. Я заслухаўся, нібы ўпершыню за многія гады пачуў праўду.

Часу хапіла толькі на гэтае галасаваньне. Вячорка набраў 152 галасы, Пазьняк 156, але ніводзін — 50 плюс 1 працэнт. Аднак не засталося ўражаньня, што галасаваньне было безвынікovым. Галоўны вынік для БНФ — Фронт не раскалоўся і цяпер ужо ведае, якім чынам засьцерагчыся ад расколу. У выпадку выбраньня Пазьняка як мінімум 50 працэнтаў удзельнікаў пакінуць арганізацыю адразу. БНФ стане таварыствам вэтэранаў адраджэньня, ня больш. У выпадку выбраньня Вячоркі Фронт можа раскалоцца толькі з волі Пазьняка, якога Вячорка з таварышамі, наадварот, уключылі ў сваю прапанову новага складу Сойму. Ня менш важны той вынік, што ў фронце цяпер ёсьць лідэр, які здольны канкураваць з Пазьняком.

Зьезд перанесены на верасень-кастрычнік.

Сяргей Паўлоўскі

РОКУ ПОЎНЫ АНДЭГРАЎНД?

28 ліпеня арганізатары канцэрту «Моладзь за Беларусь» зноўку атрымалі адмову ў правядзеньні мерапрыемства ў менскім парку 50-годзьдзя Кастрычніка. Адмова за чэрвень і ліпень пятая(!) ўжо.

Усё пачалося з заяўкі на правядзеньне 19 чэрвеня на плошчы перад опэрай мітынгу і канцэрту «Моладзь супраць фашызму». Ведаючы няроўнае дыханьне кіраўнікоў рэспублікі да маладых, зарганізаваных і ідэалягічна «правільна» падкаваных брытагаловых маладзёнаў, можна толькі падазраваць, чаму тав.Чыкіну не спадабалася пляцоўка каля Опэрнага тэатру. Была прапанаваная, на яго думку, больш прыдатная для канцэрту мясьціна: цырк Шапіто, вул.Арлоўская. Голае поле зь незразумелымі пабудовамі канца першай пяцігодкі — тое месца, дзе меўся адбыцца рок-канцэрт «Моладзь супраць фашызму». Пэўне, у тых менскіх прэрыях фашысты ўжо ня водзяцца.

Працяг адбываўся з заяўкай на правядзеньне канцэрту пад той жа назвай на той жа плошчы 11 ліпеня. На дзіва, заяўка была задаволена, але зь невялікімі адступленьнямі: 1) час правядзеньня рок-канцэрту скарочаны амаль у тры разы; 2) па пытаньнях падключэньня канцэртнай апаратуры да электрычнасьці тав.Чыкін параіў зьвярнуцца ў Менгарсьвятло, якое перанакіравала заяўнікаў да кіраўніцтва Опэрнага тэатру або параіла пашукаць аўтаномныя крыніцы энэргіі; адміністрацыя тэатру, у сваю чаргу, параіла не дурыць ёй галавы: «Падключайцеся да электрычнасьці самастойна!» Пошукі прыстасаваньня для аўтаномнага сілкаваньня праходзілі праз пажарныя часьці, але станоўчы адказ быў атрыманы толькі ў адной часьці, ды й тое — у вайсковай. Генэратар працаваў бяз збояў усю раніцу і першую палову дня 11 ліпеня на пл.Парыскай камуны, покуль не прыехалі... пажарнікі (цікава ж, дзе, апроч пажарных частак, можна ўзяць генэратар); ня той кабэль, ня той генэратар, ненадзейныя людзі ля машыны — другая забарона гатовая.

Заяўка 3: месца правядзеньня — тое ж, дзень — 28 ліпеня. Тав.Чыкін зноў адсылае арганізатараў да цырку Шапіто, дзе адзін раз канцэрт зладжваць ужо адмовіліся.

Чацьвертая адмова зарэгістраваная ў Маладэчна. У лісьце з гарвыканкаму з адмовай у правядзеньні мітынгу і канцэрту, прысьвечаных 27 ліпеня, пішуць, што «ініцыятыўная група ня можа даць гарантыю забесьпячэньня правапарадку пры такім масавым мерапрыемстве, і да таго ж вы як арганізатары ня маеце дакладнай ідэі пра сцэнар правядзеньня падобных мерапрыемстваў і арыентаваныя на стыхійнасьць яго правядзеньня». Вэрсія гучыць хоць і бязглузда, але пераканаўча. Толькі адно непакоіць: чаму ў выканкаме параілі наступны раз зьвярнуцца зь ідэяй правядзеньня да прадстаўнікоў БПСМ?

Нарэшце, пятая адмова на канцэрт 1 жніўня грунтавалася на тым, што хутка рыхтуецца нарада па выніках расьсьледаваньня Нямігі, а тут якіясь незразумелыя канцэрты, ды яшчэ просяць дапамогі ў міліцыі (во нахабства!), ды яшчэ надвор'е гарачае, ды яшчэ 21 і 27 непарадкі ў горадзе былі, ды яшчэ гурты-удзельнікі беларускамоўныя. Карацей, як бы чаво проціў легіцімнасьці не саарудзілі.

Фактычна, беларускі рок забараняюць. Будзе андэграўнд? Будзе андэграўнд.

БМА

ЛІЦЬВІН,
знайдзі свае карані і не мітуйся
сярод іншых нацыяў!
Жадаеш спрычыніцца да працэсу станаўленьня нацыі ліцьвінаў як супольнасьці вольных шляхетных людзей, жадаеш знайсьці сябе? Для цябе Літва (ВКЛ) ёсьць адзінай Айчынай? Далучайся!
ЗАЗІРНІ Ў СЯБЕ.
ТЫ ЯШЧЭ БЕЛАРУС?..
Калі ўжо — не, тэлефануй:
тэл.214-74-34, пэйдж.278-11-01 (аб. 6663)
Аргкамітэт

ЯНО І МЫ

Жнівеньскія тэзысы

Віталь ТАРАС

Мінула больш за 10 дзён з моманту, як Беларусь засталася безь легітымнае ўлады. Тэрмін цалкам дастатковы, каб усьвядоміць, з чым і з кім МЫ засталіся. Да 20-га ліпеня сытуацыя мела больш-менш віртуальны характар — г.зн., абмяркоўваліся юрыдычныя, палітычныя ды маральна-філязофскія наступствы заканчэньня тэрміну прэзыдэнцтва. (А калі ісьці шляхам фармальнае лёгікі, 21 ліпеня Беларусь засталася ня толькі без ППРБ, але ж зьнік сам інстытут прэзыдэнцтва, бо ў канстытуцыі не прапісаны момант, калі кіраўнік дзяржавы не жадае скласьці паўнамоцтвы ў сувязі з заканчэньнем кадэнцыі, а ягоны заступнік у асобе сьпікера не жадае заступаць на сваю законную пасаду. Зь нічога й ня выйшла анічога.) 21 ліпеня, абвешчанае арганізатарамі «гуляньняў» «першым днём без хлусьні» мы сапраўды апынуліся ў рэчаіснасьці — той самай рэчаіснасьці, якую мы ўпершыню спазналі, бы тыя Адам і Эва, у чэрвені 1994 году, калі стала ясна, што ўжо нішто й ніхто не перашкодзіць Лукашэнку стаць прэзыдэнтам. Падтасаваць вынікі першага туру выбараў маглі (чаму не захацелі — гэта іншая справа) кебічаўцы, ніяк не лукашэнкаўцы. Пазьняк і Шушкевіч апынуліся там, дзе знаходзяцца дагэтуль, калі верыць сацыялягічным апытаньням.

А сьвядомасьць, так бы мовіць, простага «сьвядомага беларуса» пачала круціцца ў заганным коле: ад «рукі Масквы», інакш кажучы — спэцслужбаў, якія прывялі да ўлады ў Беларусі найбольш прарасейскага кандыдата (тэзыс, які, трэба аддаць належнае Пазьняку, ён пасьлядоўна адстойвае дагэтуль) праз паняцьце «хворага народу», самабічаваньне й суіцыдныя памкненьні, ушчэнт да жаданьня зьліцца канчаткова з Расеяй, каб гэтая ганьба ўжо сканчылася нарэшце й назаўсёды, да новага тэзысу пра Пятрушку С.Паўлоўскага (далей гл. казку пра белага бычка).

Тэорыя змовы існуе столькі, колькі існуюць жыда-масоны (альбо міт пра іх). Галоўным змоўшчыкам можа быць ЦРУ, КГБ, альбо Масад — каму што падабаецца. Канечне, КГБ, ня ў прыклад ЦРУ, быў арганізацыяй нашмат больш магутнай ды страшнай, і баяліся яго на прасторах былога СССР, ды й ня толькі, зусім небеспадстаўна. Тое, што расейская ФСБ і КГБ Беларусі — спадкаемцы КГБ, таксама спрачацца не даводзіцца. Але ж ці здольная сапраўды хворая й жабрацкая Расея на якія-небудзь, хоць трохі эфэктыўныя апэрацыі супраць краінсатэлітаў? Пляны аднавіць былую імпэрыю — так. Жаданьне далучыць да яе хоць бы тую ж Беларусь — безумоўна, ёсьць. Але ж, як у тым жарце: зьесьці, мо, ён і зьесьць, толькі хто ж яму дасьць?

NATO з усім сваім вайскова-эканамічным патэнцыялам краінаў-членаў, уключна з найбагацейшай краінай сьвету ЗША — нават NATO важдалася зь Югаславіяй некалькі месяцаў, перш чым нечага дамаглася ад Мілошавіча й сэрбаў (ды ці дамаглася — гэта яшчэ пытаньне, асабліва, калі гаварыць пра сэрбаў). Дык што, Расея, аказваецца, хітрэйшая й спрытнейшая за заходнія краіны?

Дэманізацыя Расеі, між тым, нічым ня лепшы сродак для самапазнаньня беларускае нацыі, чымся дэманізацыя Лукашэнкі.

За пяць гадоў ягонага праўленьня на апісаньне ягоных дзеяньняў ды ягонай асобы, а таксама на пераказ ягоных «пэрлаў» страчаныя, мабыць, сотні тонаў паперы. Кілямэтры магнітнай і кіна-стужкі зафіксавалі ягонае непаўторнае аблічча й голас. Яго называлі й агентам Крамля, і майстрам палітычнай інтрыгі, і дубаватым дырэктарам саўгаса і крыважэрным дыктатарам з чорнай аўрай... Ніхто толькі так і не паспрабаваў разабрацца ў прыродзе ягонай улады. Бліжэй за астатніх падышоў да разгадкі, бадай, Юры Хашчавацкі ў сваім «Звычайным прэзыдэнце». Але — толькі наблізіўся, бо астатнія пэрсанажы — ня менш важныя для разуменьня фэномэну, як і галоўны герой, засталіся па-за кадрам.

Цяпер ужо ясна, што словы «фашызм» альбо «лукашызм» нічога не тлумачаць. Бо расейскі фашызм зусім ня тое самае, што нямецкі альбо італьянскі, а спэцыфічна беларускага, дзякаваць Богу, пакуль няма (калі не лічыць беларускіх паліцаяў — але ж якія там ідэйныя перакананьні, калі ў сьпіну самім карнікам глядзелі нямецкія шмайсары. Што, канечне, ня ёсьць апраўданьнем, а толькі канстатацыяй факту). А што датычыць лукашызму, дык заўтра, мо, давядзецца ўжываць які-небудзь «мясьнікізм» альбо «латыпізм». «Кебічызм», трэба думаць, мы ўжо перажылі.



Апошняя ўвага публіцыстаў сучаснае школы апошнім часам была зьвернутая на фэномэн 20 ліпеня, усе былі нібы зачараваныя гэтай датай і ейнымі магчымымі наступствамі. Так, амэрыканцы сказалі — у каторы ўжо раз — гэты хлопец ня ўмее сябе паводзіць у цывілізаваным грамадзтве. Пакуль не навучыцца, мы рукі яму не падамо. Эўрапейцы сказалі тое самае яшчэ больш далікатна — настолькі, што «джэнтльмэн» нават не зразумеў, што да яго зьвяртаюцца. І ўсё. Праблема як была, так і засталася спрадвечнай праблемай: хто гаспадар у хаце? У яе ёсьць, насамрэч, два бакі — што ёсьць нашай хатай? І хто гаспадар? Другое пытаньне падаецца другасным, бо якая хата — такі гаспадар. Дакладна так, а не наадварот, як можа здацца. Калі замест хаты — раскіданае гняздо, ніхто, акрамя якога-небудзь валацугі, на яго не паквапіцца. Іншая справа, што й былыя гаспадары паводзілі сябе неадэкватна. Замест таго, каб умацаваць падмурак ці хаця б падмайстраваць дах, яны вывесілі прыгожыя (што праўда, то праўда) старажытныя шыльду й сьцяг, а самі заняліся звыклай справай — хто крадзяжом, а хто зьвядзеньнем рахункаў з былымі паплечнікамі. Тыя, хто таксама хацеў красьці, але значна ў большых памерах і без абмежаваньняў, вырашылі не мудрагеліць — прызначылі сабе важака, выкінулі з «хаты» шаноўнае спадарства, зьнялі сьцяг і шыльду й павесілі замест іх тыя, да якіх народ (прабачце, электарат) больш прывык за апошнія семдзесят год.

Усё было б зусім проста, калі б «перад новым клясам» не паўстала дылема — красьці без абмежаваньняў, але толькі ў сваіх суайчыньнікаў, альбо абкрадаць яшчэ й суседа, але з рызыкай, што сусед начысьціць табе пысу. Адным словам, інтэгравацца з новымі рускімі ў новую гістарычную супольнасьць, альбо заставацца самастойнай бандай? Важак знайшоў «трэці шлях» — абяцаць сваім крутым хаўрусьнікам, што прынясе ў «абшчак» усе «бабкі» ды маёмасьць, а пад гэтыя абяцанкі ды братнія абдымкі, пакуль, браць крэдыты й розныя там прадукты натурай.

Шукаць паміж больш асьцярожнымі бандытамі і менш асьцярожнымі ідэалягічныя адрозьненьні можна, таксама як і адрозьненьні ў крыміналітэце (ня блытаць з мэнталітэтам) двух славянскіх народаў, але гэты занятак пакінем спрактыкаваным палітолягам. Зазначым іншае. Нацыянальнасьць Беразоўскага ня мае значэньня так сама, як нацыянальнасьць Лагвінца, Шэймана, Ціцянкова, альбо пракурора, падобнага на Бажэлку. Як напісаў адзін расейскі журналіст, у Расеі жыд — гэта больш, чымся жыд. Гэта не нацыянальнасьць, а статус. Калі ты круты, як Беразоўскі, цябе будуць баяцца й паважаць. Калі ты лібэрал кшталту Гайдара — ты небарака й масон. Амаль тое ў Беларусі. Толькі ролю выблюдкаў тут выконваюць... беларусы. Калі ты нацыянальна сьвядомы інтэлектуал, калі гаворыш на матчынай мове, калі нешта там вярзеш пра грамадзянскую супольнасьць і эўрапейскія каштоўнасьці — ты, у лепшым выпадку, гнілая апазыцыя. Калі ты належыш да магілёўскага кляну, дык будзь ты беларус, альбо жыд, альбо нават курд — ты свой, ты — «славянін». Размовы пра славянскае адзінства насамрэч даўно захапляюць хіба што аўтараў часопіса «Няміга». Сапраўдны славянскі артадокс наўрад ці прызначыць кіраўніком свайго зьнешнепалітычнага ведамства неарыйца зь нярускім прозьвішчам. На ролю славяніна падыдзе і гэбрай-рэдактар і баптыст-кіраўнік ГУОПИ. Толькі ня трэба шукаць цыганскія карані ў гэткіх праявах касмапалітызму. Ваяваць зь дзяржаўным псэўдарасізмам з дапамогай горшых праяваў нацызму — усё адно, што тушыць пажар бэнзынам.

Безумоўна, у сёньняшняй камарыльлі няма нацыянальнасьці, няма бацькаўшчыны. Але не таму, што ў іхных жылах цячэ якаясь не такая кроў, альбо нехта зь іх рос бязбацькавічам. Такія асобнікі ёсьць у кожнай краіне, у кожнай нацыі. Тым больш, хапае іх у зоне. (Напрыклад — рублёвай.) Часам яны прыходзяць да ўлады. Гэта ганебныя часы для народу. Але гэта яшчэ не трагедыя. Трагедыя здарыцца, калі мы ўсе перастанем адчуваць розьніцу паміж сабой і «браткамі», якія чамусьці ўявілі сябе элітай краіны.

Богу — Богава, крымінальнікам — крымінальны кодэкс...



ІНФАРМАЦЫЯ ДЛЯ ЧЫТАЧОЎ У МЕНСКУ

Каб чытаць сьвежы нумар «НН» у дзень выхаду — у панядзелак і пры гэтым эканоміць час і грошы, афармеце падпіску ў бліжэйшым шапіку «Белсаюздруку».

Зь ліпеня 1999 г. падпіску «да запатрабаваньня» прымае 31 газэтны шапік. Менскі «Белсаюздрук» гарантуе выдачу газэты па падпісным абанэмэнце ў дзень выхаду газэты, а таксама захаваньне не забраных вамі асобнікаў праз увесь падпісны пэрыяд.

Кошт падпіскі на «НН» на месяц (зь ліпеня) — 175 000 руб. (4 нумары ў месяц, газэта выходзіць на 12 старонках). Падпіска «да запатрабаваньня» прымаецца да 23 дня перадпадпіснога месяца ў крамах і шапіках «Белсаюздруку» г. Менску. Даведацца і высьветліць няясныя пытаньні можна па тэл. 227-88-41 у спадарыні Натальлі Сьвятохі.

Падпіска па краіне на II паўгодзьдзе 1999 году.

Кошт на 1 месяц – 192 000 рублёў, на 3 месяцы – 576 000 рублёў.

НАША НІВА

Ніжэй мы падаем сьпіс пунктаў, дзе можна падпісацца й забіраць газэту:

1. Кастрычніцкі пункт падпіскі, вул. Жукоўскага, 5, к. 1		17. Крама № 14	вул. Валадарскага, 22
2. Партызанскі пункт падпіскі, вул. А.Кашавога, 8		18. Крама № 15	вул. Танкавая, 16
3. Першамайскі пункт падпіскі, пр. Ф.Скарыны, 113		19. Крама № 16	вул. В.Харужай, 24
4. Фрунзенскі пункт падпіскі, вул. Раманаўская Слабада, 9		20. Крама № 17	вул. Някрасава, 35
		21. Крама № 18	ст. м. «Плошча Перамогі»
5. Крама № 1	вул. Жукоўскага, 5	22. Крама № 19	пр. Машэрава, 51, к. 1
6. Крама № 2	пр. Ф.Скарыны, 44	23. Крама № 20	вул. Ясеніна, 16
7. Крама № 3	пр. Ф.Скарыны, 76	24. Крама № 21	станцыя мэтро «Пушкінская»
8. Крама № 4	вул. Леніна, 15	25. Крама № 23	вул. Славінскага, 39
9. Крама № 6	вул. Філімонава, 1	26. Крама № 24	вул. Жылуновіча, 31
10. Крама № 7	вул. Якуба Коласа, 69	27. Шапік № 34	гатэль «Менск», пр. Ф.Скарыны, 11
11. Крама № 8	вул. Сурганава, 40	28. Шапік № 136	ст. м. «Плошча Якуба Коласа», выхад да Акадэміі Фізкультуры
12. Крама № 9	пр. Ракасоўскага, 140		
13. Крама № 10	вул. Асіпенкі, 2	29. Шапік № 187	гатэль «Беларусь», вул. Старажоўская, 15
14. Крама № 11	пр. Пушкіна, 77		
15. Крама № 12	вул. Кіжаватава, 80	30. Шапік № 262	гатэль «Плянэта», пр. Машэрава, 31
16. Крама № 13	вул. Каліноўскага, 82, к. 2	31. Шапік № 78	гатэль «Юбілейны», пр. Машэрава, 19

ПАДПІСНЫ ІНДЭКС 63125

БЕЛАРУСКАЯ СЛУЖБА РАДЫЁ СВАБОДА

Беларускія перадачы Радыё Свабода выходзяць у эфір тройчы на дзень:

· ПЕРШАЯ ВЕЧАРОВАЯ ПЕРАДАЧА
18.00-19.30 паводле менскага часу (15.00-16.30 UTC)
7295 кгц (41.12 м)
9610 кгц (31.22 м)
11725 кгц (25.59 м)
15565 кгц (19.27 м)

· ДРУГАЯ (АБНОЎЛЕНАЯ) ВЕЧАРОВАЯ ПЕРАДАЧА
22.00-23.30 паводле менскага часу (19.00-20.30 UTC)
6105 кгц (49.14 м)
9535 кгц (31.46 м)
9750 кгц (30.77 м)
11865 кгц (25.28 м)

· РАНІШНЯЯ ПЕРАДАЧА
(ПАЎТОР ПЕРШАЙ ГАДЗІНЫ ДРУГОЙ ВЕЧАРОВАЙ ПЕРАДАЧЫ)
6.00-7.00 паводле менскага часу (3.00-4.00 UTC)
6065 кгц (49.46 м)
7295 кгц (41.12 м)
9635 кгц (31.14 м)
9750 кгц (30.77 м)

Апрача таго, усе нашыя перадачы перадаюцца на сярэдняй хвалі 521 м (576 кгц)

У праграме:
... навіны зь Беларусі і ўсяго сьвету, правы чалавека, апазыцыя, улада, родная мова, эканоміка, мэдыцына, культура, гісторыя, эміграцыя...

Спэцыяльныя перадачы:
... Праскі акцэнт, Вострая Брама, Блізкая Эўропа, Беларускі інтэрнэт (нд), Ад панядзелка да панядзелка (пн), Гаўдэамус, Беларускія раздарожжы (аўт), Неабжытая спадчына, Паштовая скрынка 111 (чц), Новае пакаленьне (пт), Сымбаль веры (сб)...

СЬВЯТОЧНАЯ «ЭКСКУРСІЯ»

Чатырох нашаніўцаў затрымалі на Дзень Незалежнасьці

Тацяна СЬНІТКО

«Затрыманыя журналісты Клыкоўская, Сьнітко і Адамовіч былі выпушчаныя ўначы і прэтэнзіяў да міліцыі ня маюць...»
(Выпуск навінаў «Альфа-радыё», 28 ліпеня)

Нас забралі за піва... з малаком. Менавіта гэтыя напоі мы спажывалі на плошчы («за Незалежнасьць!»). Мы прыселі на парапэт мэтро й сталі назіраць відовішча. «Вывад войскаў з акупаванага гораду». З боку рэзыдэнцыі грамадзяніна Л. праехала восем грузавікоў колеру хакі зь людзьмі ў вайсковай форме. Праз хвілін 20-30 пакружылі й зьехалі «ўазікі», «Волгі» з трыма антэнамі, «Жыгулі» з зацемненым шклом і астатнія «браневікі». Мы засталіся адны — апошнія, хто «не разышоўся» зь месца акцыі.

Верагодна, менавіта гэтай думкай і кіраваліся пасажыры чырвонага аўтобуса пад нумарам 43-44 БИМ. Усярэдзіне ягонага салёну красавалася гурба знаёмага жалеза — амонаўскіх шчытоў; паабапал расьсядалі джэнтльмэны з дубінкамі.

Яны й запіхнулі нас акуратна ў салён. Мае чорна-белыя пацеркі — рассыпаліся на прыступках. Ціна і Аля робяць рух, каб сабраць, але я ім забараняю. Не хачу, каб мае сяброўкі поўзалі пад міліцэйскімі ботамі!

Аўтобус зварочвае да Савецкага РАУС. Уздыхаю з палёгкай, бо стаяць дужа нязручна — адзін абцас вісіць у паветры, ззаду ля дзьвярэй — міліцыянт.

— Люба! Мы тут! Нас яшчэ трое! — крычу ў вакно вядомай праваабаронцы Любові Лунёвай.

— Заткнись, сука, разоралась тут! — раве найбліжэйшы міліцыянт. — У камэрах будзеце перастуквацца!

Мы апынаемся ў падвальным паверсе будынку. Зьлева — аддзел тылавога забесьпячэньня, справа — стэнд пад назвай «Кодэкс чэсьці» (тут жа пачынаю вучыць ахоўнікаў парадку мове). У актавай залі за партамі сядзяць чалавек 20, затрыманых пасьля акцыі. Пазнаю «нашаніўцаў» Славаміра Адамовіча й Віктара Корзуна, знакамітую фронтаўку Веру Цэрлюкевіч, мастака Яўгена Куліка, рок-мэнэджэра таксама родам з «Нашай Нівы» Віталя Супрановіча... Тут жа й Валер Грыцюк з газэты «Наша Ўручча».

— Жыве Беларусь! — гучна вітаемся мы, і нам радасна адказваюць хорам.

Два лейтэнанты на «галёрцы» строчаць рапарты. Трэці вядзе «перапіс насельніцтва». Падхапіўшы авоську з малаком і мінэралкай, уключаю дыктафон і пачынаю ўсім задаваць пытаньні. Але «перапіс» даходзіць да мяне. «Месца працы?» — «Газэта «Ўкраіна молода», карэспандэнт у Беларусі.» Міліцыянт сыходзіць і вяртаецца з двума начальнікамі, а таксама з атачэньнем зь вельмі разьвесялелых калег чынам ніжэй. Рэакцыя на шэсьць затрыманых прадстаўнікоў СМІ прыкладна такая:

— Як, праўда журналісты? (Перабіраюць пасьведчаньні.) Божа, іх цэлая куча! Хто іх сюды пусьціў?! — начальства сыходзіць наверх разам з нашымі дакумэнтамі. Частка іхных падначаленых пачынае падміргваць і распавядае мне анэкдоты. Журналістаў то просяць «пачакаць тут», то загадваюць «пакінуць памяшканьне». Колькі разоў пасьля шэсьцяў нас не пускалі сюды, каб даведацца пра лёсы затрыманых!

— Жанчына, вы не маглі б...

— Не магла б! Такім чынам, дзе Статкевіч? Хто даў загад на затрыманьне мірных людзей?

— Прыбярыце іх адсюль! — крычыць пузаты дзядзька ў цывільным. І пачынае ўсіх «прыбіраць» да выхаду. — Ідзіце адсюль, бо тут уся наша зброя! — чамусьці зьвяртаецца ён да мяне. — Вам нельга каля зброі!..

Фота IREX-Promedia

Дэманстрацыі, арганізаваныя Грамадой, традыцыйна праходзяць весела

Самае цікавае, што я вынесла з пастарунку — гэта назіраньні за людзьмі. Нават — адзінае цікавае! Што журналістку, ды яшчэ маці малога дзіцяці, саджаць за краты — як парася стрыгчы, зразумела з самага пачатку. Віску шмат, толку — ніякага. Пакуль нам не вяртаюць пасьведчаньняў (і не пускаюць за парог), тэлефаную дачцэ.

— І праз колькі дзён цябе чакаць? — спакойна пытаецца дачка. — Будуць біцца, то дай ім здачы! — раіць яна.

Выцягваю з сумкі ярка-ружовую памаду і пішу на шкле тэлефоннай будкі: «Жыве Беларусь!» Ніякай варожай рэакцыі, але й пасьведчаньняў ніхто не аддае. Прашу калег на лавачцы лічыць час: кожныя 15 хвілінаў чаканьня — новы лёзунг памадай на сьценах РАУС. У мяне ў сумцы яшчэ адна ёсьць — карычневая! Праз пару хвілінаў мы зноў у падвальным памяшканьні (побач са збройным арсэналам).

— Хлопцы, вы вызначцеся: туды — альбо сюды! — нас амаль 2 гадзіны водзяць па маршруце «падвал — ганак». Любімая фраза аховы, што па адным водзіць паўз нас хлопцаў з Маладога Фронту: «Будзеце перастуквацца ў камэрах».

Урэшце з журналістаў бяруць пісьмовыя тлумачэньні. «Як грамадзянка Беларусі 27 ліпеня я вырашыла адзначыць Дзень Незалежнасьці...» — «Ну, Тацяна! Вы хіба не выконвалі прафэсійны абавязак?» Вядома, выконвала, але ж баялася, што ня будзе пра што паведамляць. Цяпер МУС стварыла інфармацыйную падставу: рабяты са шчытамі плюс 6 журналістаў: «От Советского Информбюро»...

— Дапішыце пра грамадзянку, Незалежнасьць і разарваны бранзалет!

— «... который был мне дорог как память», — ловіць маю думку ў палёце малады зеленавокі міліцыянт. Яго зваць Дзімам. Сымпатыі міліцыянтаў, адчуваецца, на нашым баку: лепей мець журналістаў не ў якасьці ворагаў! «С моих слов записано верно, Жыве Беларусь!» Выпраўляю памылкі ў склонах. Міліцыянты раяць у канцы паставіць адзнаку...

З аддзелам пад назвай «ООПП» («Охрана общественного порядка и профилактики») расстаемся даволі цёпла. Што будзе з астатнімі больш як 20-цю «парушальнікамі»? Ніхто ў РАУС «адказаць не гатовы». Цяжка сыходзіць, пакідаючы гэтых людзей тут, і яшчэ цяжэй будзе ранкам пачуць, што 19 зь іх, у тым ліку 11 жанчын, правялі ноч на Акрэсьціна. З актавай залі нёсься ціхі сьпеў хорам. Мілыя людзі, ад вашага сьпеву стала так хораша на душы...

Начальнік «ООПП» на разьвітаньне цалуе ручку. Назаўтра я з упартасьці прынясу яму патрабаваную ім даведку з Кіева, што «сапраўды зьбірала матэрыял» (някепская ілюстрацыя да рэпартажу выйшла!). Сустрэчныя мянты будуць даводзіць, што яны «ня монстры» — адпусьцілі ж, маўляў, учора жанчыну-інваліда. І жанчыну зь дзіцём да 11 гадоў. Будуць выказваць думку, што спэцназ — боты, дубы і ўсё такое, бо дадумаліся затрымаць журналістаў. Будуць казаць брудныя камплімэнты. Прапануюць, трасянуўшы мінулым, напісаць матэрыял пра барацьбу з рабаўнікамі ды злодзеямі. Але калі вы гэтак з намі, дык як тады з астатнімі? І хто ў вас рабаўнік і злодзей?

За наша незаконнае затрыманьне ніхто зь міліцыянтаў так і не перапрасіў. Што да мяне асабіста — дзякуй за сьвяточную «экскурсію»! Але любімага бранзалета Савецкаму РАУС і астатнім прадстаўнікам рэжыму я не дарую. ■

ВАЙСКОВАЯ СПРАВА Й ПАЛІТЫКА

Вадзім КАРЦАЎ

Пра войска ў нашым нацыянальстычна-апазыцыйна-інтэлігенцкім асяродку згадваюць нячаста.

Няма чаго казаць зь дзьвюх прычынаў: мала хто служыў, каб валодаць тэмай, ды самая тэма не арыгінальная — сэнсацыі ня зробіш. Журналісты, калі й пішуць, традыцыйна абмяжоўваюцца дзедаўшчынай, крадзяжамі армейскай маёмасьці ды высокім працэнтам, паводле статыстыкі, даверу насельніцтва да ўзброеных сілаў як да дзяржаўнай інстытуцыі.

Ну, яшчэ чутны бясконцы сьцёб з разумовых здольнасьцяў і легендарнага нахабства дэмбэляў, прапаршчыкаў і генэралаў: показкі з барадою, як у аднаго вядомага марскога афіцэра-дэпутата.

Цывілізацыя, моцная ейная палова, стагодзьдзямі б'ецца, шукаючы ўнівэрсальныя адмычкі да жаночых сэрцаў. На што купілася б любая? Пра што завесьці гаворку, каб аднолькава мэлядычна пайграць на струнах душы пятнаццацігадовай «цукеркі» й прыгажуні ўдваяўтрая старэйшай? Пра гэта — іншым разам, а зараз — пра ключ да мужчынскіх душаў, які даўно вынайдзены, пра вайсковую справу.

Яна яднае ўсіх мужчынаў, незалежна ад ступені іхнае пацыфічнасьці. Толькі кагосьці цягне да практыкі, а камусьці прывабныя адно эстэтыка й рамантыка.

Паталягічна няздатны трымаць у руках аўтамат хлопец-акулярык, патлаты праграмайстра з захапленьнем глядзяць баевікі пра якіх-небудзь камандас. Найпамяркоўнейшы з талерантных адраджэнец, што ўцякае зь мітынгу, толькі ўбачыўшы міліцэйскія дручкі, і сьпяшаецца ў касьцёл прасіць Бога за Бацькаўшчыну, увечары, седзячы з прыяцелямі на варэльні, спакойна разважае пра пляны нэўтралізацыі дыктатара: колькі й дзе павінна быць снайпэраў і сапёраў, з каго павінна складацца й як дзейнічаць група зьнішчальнікаў спэцыяльнага прызначэньня, дзе, на якой трасе, варта закласьці фугасы, а дзе можна абысьціся гранатамётамі.

Мілітарызаваная сьвядомасьць беларусаў ня ёсьць савецкаю спадчынай. Наадварот, генэтычна запраграмаваны ў нас яшчэ з часоў ВКЛ ваярскі дух, бы цьвік у боце, муляў усходняму акупанту, пэрманэнтна цярпеўшаму то масавыя паўстаньні, то геройскія ўчынкі адзіночак.

Самы ваяўнічы ў сьвеце герб — беларускі. Імклівы вершнік, што гатовы зьнесьці галаву любому на сваім шляху, найлепш цвердзіць пра наш баявы характар. Менавіта таму савецкія ўлады мусілі скіроўваць вайсковую энэргію й патэнцыял беларускіх юнакоў у гульні кшталту «Зарніцы». Ня ведаю як дзе, але ў Барысаве, адкуль я родам, у раёне танкарамонтнага заводу, дзе я жыў, ці не палова падлеткаў мелі самапалы — саматужныя пісталеты, якія з аднаго стрэлу разносілі знойдзены дзесьці сьвіны чэрап у ашмёткі.

Як вы лічыце, чаму ў авантурныя інтэрнацыянальныя кампаніі ўцягвалася беларусаў болей, чым якіх іншых з паняволеных народаў? Спытайцеся ў якогась вайскоўца, што засьпеў СА, каго ставілі ў адказныя каравулы, у баявыя дзяжурствы на ракетныя шахты, хто наогул быў найлепшым служакам?

Даводзілася чуць, што беларуская армія сёньня — гэта безнадзейна зрусіфікаваная сыстэма. Маўляў, ня варта нават кранаць яе, бо дарэмна патраціш сілы й час. Адказ упэўнены: нашае войска ў спрыяльны момант стане ўзорам хуткага пераходу да беларускасьці, бо ў сыстэме, збудаванай на прынцыпе безагаворачнага падпарадкаваньня, маючы ўладу, можна правесьці хоць кітаізацыю.

Здымак з асабістага архіву В.Карцава

Згадваю, як сам служыў у 94-96-м. Немагчыма перадаць хваляваньне, душэўны ўздым пад час прысягі са зброяй у руках пад нашым сьцягам ды на роднай мове. Сапраўдны інтэлектуальны аргазм наступаў пад час спрэчак на гістарычныя тэмы з зампалітам, капітанам родам з Разані. Памятаю, той даводзіў пра славянскае паходжаньне Вітаўта, бо гэтак было напісана ў дапаможніку па гісторыі, выдадзеным Міністэрствам

вестkі зь Літвы

Літоўцы падтрымалі Шарэцкага



Фота Даніла Рамашкі

Сямён Шарэцкі ў гасьцях у Таварыстве Беларускай Культуры ў Літве

Пасьля сустрэчы з калегам В.Ландсбэргісам, які старшынюе ў літоўскім сэйме, старшыня Вярхоўнага Савету Беларусі 13-га скліканьня Сямён Шарэцкі атрымаў двух ахоўнікаў. Сёньня С.Шарэцкі, змушаны ўцякаць ад нелегітымнага Лукашэнкі, жыве і працуе ў Вільні. Адныя кажуць, што ён там як прыватны турыст, а другія — што як выканаўца абавязкаў кіраўніка Рэспублікі Беларусь паводле Канстытуцыі, — каму як выгадней. Літоўскім парлямэнтарам выгадней разглядаць яго як кіраўніка. Таму з пачаткам восеньскай сэсіі ў сэйме Літвы будзе зарэгістраваная адмысловая парлямэнцкая група па сувязях з распушчаным Вярхоўным Саветам Беларусі. Пра гэта пасьля сустрэчы з С.Шарэцкім заявілі дэпутаты сэйму Літвы Рытас Купчынскас, Саўлюс Пячалюнас і Ігнацас Уждавініс.

Крыху болей віна і піва

«Наша Ніва» пісала неяк, што літоўцы на памежных пераходах, дзе няма мытні, прымушаюць, калі едзеш зь Беларусі, выліваць гарэлку і віно, а дзе мытня ёсьць — там вязі толькі паўлітра гарэлкі, віна і піва. Цяпер крыху лібэралізавалі гэтае дзела. Можна ўжо два літры піва і два літры віна. Дарэчы, беларускае піва некаторым лепш смакуе за літоўскае, бо хоць там і сотні тых гатункаў, але наш напой шчыльнейшы, гусьцейшы, не такі газаваны і мае менш голага сьпірту.

Кошты на рынку

На папулярным віленскім рынку «Галя», каля чыгуначнага вакзалу, дзе беларускія цёткі штодня выстройваюцца радком з раскладзенымі на зямлі малочнымі прадуктамі, таемна дастаўленымі з Бацькаўшчыны, на мінулым тыдні кошты харчоў былі наступныя (у літах за кіляграм/літар, у адным даляры — чатыры літы, то бо за адзін літ — 112 тысяч нашых рублёў):

яйкі — 1,60-2,00
алей — 4-6,00
селядцы з галовамі — 5,20-3,90
жывы карп — 7,70-7,50
цукар — 3,00
мука 2 кг — 3,20
кава «Jacobs» — 250 г — 9,50-9
разынкі — 7-6,50
земляныя арэхі — 4,00-5,00
памідоры — 2,00
часнык (галоўка) — 0,70
цыбуля — 1,30-0,80
морква — 2,00
буракі — 0,80-1,00
бульба — 0,70-1,00
капуста — 0,50-1,00
яблыкі (папяроўкі) — 1-1,50
бананы — 2,30
мёд — 19,00
слоічак хрэну 200 г — 2,00

Каб добра параўноўваць, трэба ведаць, што мінімальны заробак у Літве крыху большы за 400 літаў, што значыць, за сто даляраў.

Кажуць, сёлета ў параўнаньні зь леташнім надта станьнеў мёд, быццам гэты год мёдам ажно плыве. ■

абароны, па-беларуску, дарэчы.

Гурбы саслужыўцаў прыходзілі глядзець улёткі «Правага Рэваншу», што даслаў Славамір. Уначы, замест таго, каб спаць, разам з адным гомельскім хлопцам мы пісалі ў Фонд Сораса праект стварэньня незалежнае сыстэмы распаўсюду прэсы. А Гермянчук, ледзьве не завалены маімі бяздарнымі армейскімі нататкамі, проста змушаны быў друкаваць сёе-тое ў «Свабодзе». Тэрміновая служба сталася для мяне вышэйшай школай патрыятычнае загартоўкі. Беларускасьць стварала нябачны абаронны кумпал, які не наважваліся парушыць ні «дзяды», ні камандзіры.

Калі ж бязь лірыкі, дык той факт, што нашыя палітыкі абыходзяць вайсковую тэму, ня робіць ім гонару. Марнаваньне магчымасьцяў, элемэнтарная непрафэсійнасьць — сядзець бязь дзела, калі дастаткова проста загаварыць пра армію, каб мільённая мужчынская аўдыторыя адгукнулася.

Трэба, найперш, стварыць сыстэму салідарнай падтрымкі, каб кожны зь беларускамоўных навабранцаў быў надзейна абаронены ад нестатутных адносінаў, галаданьня і авітамінозу. Даслаць ста салдатам па лісьце й блёку цыгарэтаў нармалёвай арганізацыі па сілах.

Сабрацца ўтраіх ды праведаць выходнымі якогась са сваіх у бліжэйшай в/ч, пагутарыць з сэржантамі, занесьці бутэльку начальству — што прасьцей? І ці ж гэта не палітыка? Паралельна трэба весьці агітацыю за скарачэньне тэрміну абавязковага прызыву да шасьці месяцаў. Тады будуць вырашаныя старыя праблемы: нежаданьне й боязь ісьці служыць і дзедаўшчына. За паўгады рэальна авалодаць любой вайсковай спэцыяльнасьцяй, калі гэтым часам не фарбаваць борцікі й не працаваць на лецішчы ў палкоўніка.

Касьцяк войска павінны скласьці прафэсіяналы — 10-20 тысячаў наёмнікаў. У выпадку небясьпекі для краіны — мабілізацыя фізычна здаровых мужчынаў і ўзбраеньне астатняга насельніцтва. Для цывільнага люду можна ладзіць добраахвотныя ваенныя вышкалы на тыдзень-два. Думаецца, ахвочых будзе шмат. Гэта досьвед бальшыні заходнеэўрапейскіх краінаў. Там на армейскіх рэформах павырасталі цэлыя дынастыі палітыкаў.

Вайсковая справа й палітыка — рэчы, зьвязаныя наўпрост. Як той казаў, народ і армія — разам! ■

Сяргей РАДШТЭЙН

ТЫДЗЕНЬ СТАБІЛЬНАСЬЦІ

Біл Клінтан: «Адказам прыхільнікам Вялікай Сэрбіі і Вялікай Альбаніі будзе Вялікая Эўропа"

На мінулым тыдні расейскі прэм'ер Сяргей Сьцяпашын пабываў у Амэрыцы. Да яго прыглядаліся як да патэнцыйнага будучага кіраўніка Расеі. Ён ехаў, каб палепшыць расейска-амэрыканскія стасункі, што апошнім часам дайшлі амаль да ўзроўню халоднай вайны. Амэрыканцы ймкнуліся да вырашэньня палітычных пытаньняў. Расейцам жа найперш важна наладзіць эканамічнае супрацоўніцтва. Перамовы йшлі пад відавочную дыктоўку амэрыканцаў. Рэанімуючы камісію па эканамічным супрацоўніцтве, Сьцяпашын сьцьвярджаў, што «камуністы ніколі ня вернуцца да ўлады», але ці хто ягоным словам паверыў?

Амэрыканскія газэты глядзяць на Сьцяпашына як на чарговага фаварыта Ельцына, што мае ня больш шанцаў на «выжыванне», чым яго папярэднікі. Супярэчнасьці на перамовах былі звычныя ўжо: пра ролю ЗША ў сьвеце, косаўскую дактрыну Клінтана, расейскае віжоўства (амэрыканцы пагразілі, што калі расейцы ня вывезуць сваіх шпіёнаў з Амэрыкі, то яны сілай іх павысылаюць — значыць, ведаюць іх), продаж Ірану ядзерных тэхналёгіяў... З апошнім увязалі працяг кантракту на запуск з расейскіх пляцовак амэрыканскіх спадарожнікаў, што моцна дапамагае ўшчэнт спляжанай расейскай касманаўтыцы.

Дасягнутая дамоўленасьць і пра тое, што неўзабаве пачнуцца кансультацыі па новай дамове дзеля скарачэньня стратэгічных наступальных узбраеньняў — згодна зь ёю бакі мусяць скараціць сваю зброю да 2000—2500 адзінак. Але што толку ад гэтых абмеркаваньняў, калі расейская дума так і не ратыфікавала папярэдняй — СНВ-2 (скарачэньне да 3500). Справа ў тым, што звычайнае войска РФ хранічна ні на што ня здатнае, а магчымасці амэрыканцаў ўсе добра бачылі ў Іраку ды Югаславіі. І пры роўнасці стратэгічных узбраеньняў РФ згубіць рэшткі сваёй вагі і ўплыву. Што да непасрэднага уплыву гэтага візыту на Беларусь, дык у часе яго абмяркоўвалася пэрспэктыва стварэньня ў Расеі сумеснага прадпрыемства па вытворчасьці амэрыканскіх трактароў «Джон Дзір», што стала б жахлівым ударам па нашым Менскім трактарным заводзе.

Аднаўляецца супрацоўніцтва РФ і з сусьветнымі эканамічнымі інстытуцыямі — краіна пішчом лезе ў Сусьветную гандлёвую арганізацыю (WTO), таму хоча, каб яе эканоміку прызналі рынкавай. Нягледзячы на наяўны 130-мільярдны доўг (праўда, часткова яшчэ савецкі), праваленую рэструктурызацыю банкаўскай сыстэмы, падман крэдытораў, Расеі нібыта зноў дадуць крэдыты.

Неўзабаве пасьля візыту аб'явілі пра тое, што мае зьмяніцца галоўнакамандуючы NATO ў Эўропе: Уэсьлі Кларка зьменіць генэрал авіяцыі Райстоўн, што пацьвярджае значэньне, якое натаўцы надаюць паветраным сілам, чыя эфэктыўнасць выявілася ў Югаславіі (хаця некаторыя ў гэтым сумняваюцца, бо вайсковыя страты Сэрбіі невялікія — максымум 200 адзінак усялякай (ад танка да матацыкля) вайсковай тэхнікі. Праўда, на 10 000 натаўскіх удараў прыпала толькі 29 памылак і страчана пры гэтым толькі 2 самалёты.

Тым часам у Косаве альбанскія банды напалі ўжо на 12 цэркваў, у тым ліку і на галоўную прышцінскую, у якую кінулі гранату. Натаўскія вайскоўцы, падобна, сьпяць у шапку.

Днямі ў Сараеве была сустрэча кіраўнікоў ды прэм'ераў рэгіёну й сьвету (за выняткам СРЮ) дзеля эканамічнай і палітычнай стабілізацыі ды інтэграцыі ў эўрапейскія арганізацыі (Клінтан сказаў: «Адказам прыхільнікам Вялікай Сэрбіі і Вялікай Альбаніі будзе Вялікая Эўропа"). Падпісалі так званы Пакт стабільнасці, што па задуме мусіць стаць своеасаблівым міжнародным органам пад эгідай АБСЭ. Усё гэта параўноўваюць з Патсдамскай канфэрэнцыяй пасьля другой сусьветнай, бо трэба адбудаваць рэгіён, што перажыў за апошняе дзесяцігодзьдзе 4 вайны. Абяцана досыць шмат грошай, але канкрэтная сума яшчэ ня вызначана — будуць працаваць экспэрты. Канчатковае рашэньне прымуць у сьнежні. Мілошавіцкай Югаславіі ніхто, апрача Расеі, дапамагаць ня хоча. Але й Масква зьбіраецца дапамагаць Сэрбіі вельмі цікавым чынам: Сэрбіі будзе дадзена разнастайнай дапамогі на 150 млн. даляраў — менавіта тую суму, якую РФ вінна братняму ўраду. Клінтан жа на сустрэчы ў Сараеве паабяцаў $10 млн. на падтрымку незалежных сэрбскіх прафсаюзаў і вольнай прэсы .

Тымчасам высьвятляюцца прычыны памятнага ўсім кідка расейскіх дэсантнікаў. Сьцьвярджаюць, што проста яны хавалі сьляды парушэньня РФ эмбарга на пастаўкі зброі . Дэсантнікі адразу ж захапілі аэрапорт Прышціны, дзе заставаліся рэшткі нявывезенай зброі, ды да гэтага часу не дазваляюць агледзець ангары, што ўзмоцнена ахоўваюцца, хаця расейскае МЗС і цьвердзіць, што яны пустыя. Кажуць, Расея перадала Мілошавічу батарэю зэнітак С-300 і такія радары, што бачаць нават «Стэлз». Пэўна, пастаўкі ажыцьцяўляў як бы і не расейскі ўрад, а прыватныя фірмы. За «ўзяцьце Прышціны» ўсім дэсантнікам дадуць па ордэне.

У Гішпаніі паліцыя правяла «зачыстку» ад расейскай мафіі самага дарагога курорту краіны. Там жывуць арабскія шэйхі, мультымільянэры ды мафіёзі. Кожны палац тамака каштуе ня меней за $1 млн., а толькі гатоўкай знайшлі $4 млн. Дык з 12 мафіёзі: 9 — расейцы, 1— летувіс ды ДВА БЕЛАРУСЫ. Ё ўсё ж між нас стабільныя людзі!.. ■

сьвет мастацтва

Знайшліся ўладальнікі

На мінулым тыдні лёнданская галерэя «Tate», якая каардынавала працу па ідэнтыфікацыі твораў мастацтва, зьвезеных нацыстамі, стала першай, хто атрымаў запыт ад жыдоўскае сям'і наконт адной з карцінаў, што належала ім да вайны. Гэтыя нашчадкі нямецкіх жыдоў, што жывуць сёньня ў Брытаніі, зрабілі запыт наконт палатна Яна Грыфэра «Від на палац Гемптан Корт», напісанага ў першай палове 18 ст. Яны сьцьвярджаюць, што іх бацька-банкір быў закатаваны немцамі ў 1937-м, а маці зьбегла ў Бэльгію зь сямейнай калекцыяй твораў мастацтва. Калі ж немцы акупавалі і Бэльгію, яна хавалася й была змушаная саступіць карціну значна таньней за яе рэальны кошт. Пасьля і яна патрапіла ў канцэнтрацыйны лягер, але выжыла й па вайне пераехала ў Англію. Тут праз шмат гадоў зьявілася й тое палатно Грыфэра ў галерэі «Tate»... Сёньня яго ацэньваюць у 200 тысячаў фунтаў, альбо ў 330 тысячаў амэрыканскіх даляраў. Калі гэтая гісторыя будзе дакумэнтавана пацьверджана, то галерэя альбо верне карціну, альбо сплоціць гэтую суму. Гэтак можа быць запачаткаваная новая хваля рэстытуцыяў, што зноў прывядзе да руху мастацкіх каштоўнасьцяў з рук у рукі.

На сваё месца

У косаўскім мястэчку Гнілане альбанцы нядаўна паламілі помнік прынцу Лазару. Менавіта гэты прынц узначальваў славянскія войскі пад час сечы на Косавым полі ў 1389 годзе. Трагічная постаць прынца Лазара стала сымбалем сэрбскага супраціву туркам. Аднак майстры з натаўскага міратворчага кантынгенту адрэстаўравалі помнік і пры канцы мінулага тыдня ўсталявалі яго на месца. Касавары гэтым моцна абураныя й пагражаюць зноў скінуць манумэнт і зьнішчыць дазваньня. На гэта яны атрымалі адказ з боку натаўскага капітана Леры Камінскага, які камандуе тутэйшым кантынгентам: «Гэта сымбалічны акт з нашага боку. Калі альбанцы зноў зьвернуць помнік, мы зноў яго адновім. Людзі ўрэшце павінны зразумець, што нельга зьневажаць чужую культуру ці адбіраць у іншага народу ягоныя духоўныя скарбы. Бо ў такім разе пасьля ня можна чакаць, што нехта будзе шанаваць і паважаць тваю».

Сьмерць і адкрыцьцё

На гэтым тыдні адкрываецца найбуйнейшая ў сьвеце выстава твораў Ван Гога ў Музэі «Мэтраполітэн», што ў Нью-Ёрку. Аднак, на ёй ня будзе самай дарагой карціны ў сьвеце, напісанай гэтым геніяльным мастаком, «Партрэта доктара Гашэ». Гэта адзін з апошніх твораў мастака, на якім выяўлены Поль-Фэрдынанд Гашэ, які лячыў мастака і стаў першым калекцыянэрам ягоных работ. У 1990 годзе гэтае палатно на аўкцыёне набыў японец Рыёчы Сайта за абсалютна рэкордную суму ў 82 мільёны даляраў. У 1996 гэты пакупнік памёр, перад тым папрасіўшы спаліць карціну, каб спадкаемцам не давялося плаціць за яе шалёны падатак. Падазраюць, што парэшткі Сайта спалілі разам з карцінаю... На адну таямніцу стала болей. Але на выставе будуць паказаныя і наноў адкрытыя карціны, якія лічыліся страчанымі ў часе вайны, скрадзеныя з розных збораў і перавезеныя ў ЗША. Пасьля экспазыцыі некаторыя зь іх будуць вернутыя колішнім уладальнікам, калі гэткія адгукнуцца...

Антон Сіюль

ЗАБРАНЫЯ СКАРБЫ

Паводле новага расейскага закону беларусы праз 55 гадоў пасьля вайны апынуліся па-за межамі антыгітлераўскай кааліцыі

20 ліпеня Канстытуцыйны Суд Расеі прызнаў, што краіны, якія не ваявалі на баку фашыстоўскае кааліцыі ў апошнюю вайну, маюць права прэтэндаваць на вяртаньне культурных каштоўнасьцяў, якія пакуль перахоўваюцца ў Расеі. Адначасова абумоўлена, што саюзьнікам фашыстоўскае Нямеччыны нічога вернута ня будзе.

Суд разрашыў канфлікт паміж Дзярждумаю і Ельцынам. Расейскі парлямэнт прыняў гэты закон яшчэ ўвесну 1997 году. Ельцын спыніў ягонае дзеяньне. Аднак і Дзярждума, і Савет Фэдэрацыі адмянілі гэтае вэта. Ізноў Ельцын адмовіўся падпісваць, спаслаўшыся на парушэньне рэглямэнту пры прыняцьці закону. Аднак, насуперак ягонай волі, закон уступіў у сілу 6 красавіка 1998 году. І Канстытуцыйны Суд абавязаў Ельцына яго падпісаць. Загнаны ў кут, расейскі прэзыдэнт закон аб перамешчаных каштоўнасьцях падпісаў, але адразу вярнуў яго ў той жа Суд, патрабуючы перагледзець, ці ён канстытуцыйны. І вось суд вынес апошні вэрдыкт...

Ідзецца пра тыя мастацкія й культурныя скарбы, якія савецкія войскі забралі на вызваленых ад немцаў тэрыторыях. Пікантнасьць сытуацыі ў тым, што юрыдычна й фактычна саюзьнікамі Нямеччыны былі Аўстрыя, Баўгарыя, Вугоршчына, Румынія ды Славаччына. Паводле новага закону яны не атрымаюць нічога.

Вярнуць усім, у тым ліку і немцам, каштоўнасьці, паабяцаў М.Гарбачоў, што садзейнічала ягонай асабістай папулярнасьці. Ён падпісаў артыкул 16 Дамовы пра савецка-нямецкае сяброўства, дзе гаворыцца пра ўзаемнае вяртаньне каштоўнасьцяў без агаворак. Але апошні савецкі міністар культуры М.Губенка заявіў, што гэта адбудзецца не раней, чым немцы выплацяць СССР 1200 мільярдаў далераў!

Да справы гэтую дамоўленасьць давёў Ельцын пад час візыту ў ФРН кастрычніку 1991 году. Тады яму прадставілі каталёгі й дакумэнты, якія сьведчылі пра знаходжаньне ў Расеі нямецкіх скарбаў, скрадзеных у вайну. Напрыклад, была разрабаваная самая багатая галерэя Нямеччыны ў Брэмэне і да сёньня ў краінах СНГ знаходзіцца 1778 твораў зь яе. Апроч таго, напрыклад, у Дзяржархіве Расеі выяўленыя 2 мільёны (!) сярэднявечных нямецкіх рукапісаў. У сховах Маскоўскага гістарычнага музэю ляжаць калекцыі зброі нямецкіх кайзэраў. А ў Кіеве, ва ўкраінскім Музэі мастацтва Ўсходу, апынуліся рукапісы й малюнкі Гётэ зь ягонага дому-музэю ў Вэймары. У падвалах, сэйфах ды сховах ад Менску да Баку трэба шукаць 15 тысячаў экспанатаў з Дрэздэнскага кабінэту гравюраў, фонд Саксонскае дзяржаўнае бібліятэкі, скарбы з Вартбурскае збройнае палаты, бясцэнны «Скарб цара Прыама» з Троі, які належаў Бэрлінскаму музэю, а таксама скарбы зь дзяржаўных, царкоўных ды прыватных збораў з усяе Ўсходняе Эўропы.

Рэч у тым, што гэтыя скарбы ня ўведзеныя ў навуковы ўжытак, часта іх ня бачылі нават спэцыялісты. Бо яны — скрадзеныя... Таварышы з Політэхнічнай акадэміі ў Менску, напрыклад, у 1996 годзе на свой розум аддалі назад у розныя краіны трафэйную бібліятэку з аўтографамі й рукапісамі клясыкаў навукі ды літаратуры. Як кралі, гэтак і вярталі... Ніхто тую бібліятэку не пабачыў за 50 гадоў...



«Блакітнае Ўспеньне», абраз XV ст. зь менскага сабору Сьвятога Духа, зьвезены пад час польска-бальшавіцкай вайны ў 1920 годзе. Сёньня ў экспазыцыі Трацьцякоўскай галерэі ў Маскве.

У новым расейскім законе краіны былога СССР зусім не фігуруюць. Спробу падпісаць у 1991 годзе дамову ў СНГ пра ўзаемнае вяртаньне каштоўнасьцяў правалілі. Расея адмовілася нават абмяркоўваць гэтую тэму. А ў мэдыях акадэмік Ліхачоў абгрунтаваў расейскія правы на скарбы зь Беларусі, Украіны, Каўказу ды Цэнтральнай Азіі: маўляў, расейцы за іх заплацілі сваёй крывёю, усіх баронячы й адукоўваючы. Таму і новы закон ні да чаго не абавязвае Расею ў дачыненьні да Беларусі. І тое, што рабавалася ў 39-м у Заходняй Беларусі, што не вярнулася з эвакуацыяў, застаецца ў Расеі. А ў нас няма законнае падставы вярнуць, напрыклад, скарбы Магілёўскага музэю, дзе былі ўнікальныя каштоўнасьці з Пампэяў, Грэцыі ды Заходняе Эўропы, Эўфрасіньнеў крыж ды безьліч іншых скарбаў. Парадаксальным чынам мы ў гэтай справе праз 50 гадоў пасьля вайны аказаліся прыроўненымі да немцаў.

Сяргей Харэўскі

ДЗЕ І ДЛЯ КАГО

Дбаньнем навукоўцаў на чале з А.Мальдзісам зробленыя цікавыя знаходкі: у Маскве адшукалі важныя часткі Праскага беларускага архіву з матэрыяламі беларускае эміграцыі ў Празе; у Польшчы выявілі архівы, вывезеныя ў 1919—20 г.. А ў Вільні Арсень Ліс знайшоў малавядомы фонд, зьвязаны зь Віленскім беларускім музэем.

Паводле старшыні Дзяржінспэкцыі па ахове помнікаў Дз.Бубноўскага, «найлепш у нас разьвіваюцца стасункі з Польшчай, існуе адпаведная міжурадавая дамова». У пэрспэктыве, мяркуецца, падпішуць такія пагадненьні з усімі краінамі, дзе знойдзецца хаця б якая значная частка нашае спадчыны. Менавіта Беларусь распрацавала праект пагадненьня між краінамі СНД па рэстытуцыі каштоўнасьцяў, якое ўзгоднілі з урадамі ўсіх краінаў былога СССР, апроч Расеі. (У гэтым праекце ўпершыню зьвяртаюць увагу на складанасьці з прыналежнасьцю спадчыны ВКЛ. Тут існуюць два крытэры ідэнтыфікацыі: твор (дакумэнт, кніга) павінен знаходзіцца або ў тым месцы, *дзе* ён быў створаны, або ў месцы, *для якога* ён быў створаны — так, Радзівіл мог замаўляць карціны для аздабленьня Нясьвіскага замку нават у Італіі.)

Пытаньнямі рэстытуцыі, гэта значыць «вяртаньня незаконна перамешчаных каштоўнасьцяў», у Беларусі займаецца таксама адмысловая камісія па міжнародных зносінах пры «савеце рэспублікі». Варта ўдакладніць, што «незаконна перамешчанымі» лічацца толькі тыя культурныя здабыткі, якія былі вывезеныя ў парушэньне зь дзейным на час вывазу заканадаўствам (то бок, калі рэч «пераехала» ў Маскву за часоў ваеннага камунізму ў адпаведнасьці з «законам рэвалюцыйнае мэтазгоднасьці», мы ня маем права патрабаваць яе вяртаньня).

Андрэй Скурко

Адам Мальдзіс:

«Спачатку — выяўленьне і сумеснае выкарыстаньне»

Працяг са старонкі 1.

Аднак рэстытуцыя — вельмі складаны і доўгі працэс, таму на сёньняшнім этапе першапачатковым зьяўляецца не пытаньне вяртаньня, а праблема выяўленьня і напачатку сумеснага выкарыстаньня, якое прадугледжвае і магчымасьць арганізоўваць тут выставы твораў мастацтва, што былі створаныя у Беларусі, але зараз захоўваюцца за мяжой, і абмен копіямі, а то й арыгіналамі, калі яны знаходзяцца дзесьці не ў адзінкавым экзэмпляры. Так, у Маскве, у Дзяржаўнай бібліятэцы і Дзяржаўным гістарычным музэі, захоўваюцца па некалькі асобнікаў аднаго і таго ж выданьня Скарыны, тады як у Музэі беларускага кнігадрукаваньня ў Полацку няма ніводнага арыгіналу. Расейскаму боку варта было б зьдзейсьніць акт добрай волі і перадаць нам што-кольвек з тых выданьняў, тым больш, што там гэтыя кнігі ляжаць незапатрабаваныя. Згадайце, колькі твораў мастацтва, канфіскаваных на гарадзенскіх і берасьцейскіх мытнях, беларускі бок вярнуў уладальнікам — той жа Расеі?

Цяпер мы працуем над выданьнем 6-га зборніку сэрыі «Вяртаньне». Самі разумееце, што назва выклікае ў нашых замежных калег адмоўную рэакцыю, таму мы заўсёды падкрэсьліваем, што робім стаўку перш за ўсё на выяўленьне і сумеснае выкарыстаньне культурных каштоўнасьцяў. І пошук, якім бы цяжкім ва ўмовах вялізных аб'ёмаў архіваў і фондаў ён ня быў, мае надзвычайнае значэньне: калі ведаеш, дзе канкрэтна знаходзяцца патрэбныя матэрыялы, можна ня ехаць самому за блізкі сьвет, а проста паслаць туды запрос і зрабіць копію — гэта нашмат таньней.

«НН»: А ці здаралася так, што перададзеныя нам каштоўнасьці, як гэта бывала ў 20-я г., памылкова траплялі на іншую адрэсу — у Літву, скажам? Як увогуле вяжуцца адносіны зь Літвой у галіне высьвятленьня прыналежнасьці культурнага даробку?

А.М.: Літоўцы заўсёды мелі ў гэтым пытаньні сваю палітыку. Аднак, ізноў жа, ніхто ня кажа пра неадкладную і бескапрамісную рэстытуцыю або падзел — нават таго самага віленскага скарбу — ужо таму, што ён знойдзены на тэрыторыі Літоўскае Рэспублікі (ды яшчэ ў катэдры), хаця ясна, што 60—70% знойдзеных каштоўнасьцяў генэтычна паходзяць зь Беларусі. Але наўрад ці нам варта зза гэтага распачынаць вайну. Я прапанаваў літоўскаму боку ў якасьці маральнае кампэнсацыі Беларусі аднавіць у Вільні, у Базыльянскіх мурах Віленскі беларускі музэй як беларускалітоўскі культурны асяродак, што садзейнічаў бы збліжэньню нашых народаў. Зараз у Літве па ініцыятыве прэзыдэнта Адамкуса створаны Скарынаўскі фонд. Я лічу, што гэта яго першачарговая задача — адраджэньне Віленскага беларускага музэю, зьбіраньне разам яго матэрыялаў, што зараз раскіданыя па некалькіх установах. Узьнікаюць нявырашаныя пытаньні і зь іншымі нашымі суседзямі — Украінай, Польшчай. Так, нядаўна мы атрымалі зь Вялікай Брытаніі ліст, аўтар якога — беларус — узьнімае пытаньне пра мэтрычную кнігу навагрудскага касьцёлу з запісам пра нараджэньне Адама Міцкевіча, што была незаконным шляхам вывезеная ў Польшчу і зараз перахоўваецца ў адным са славутых кляштараў. Некалькі разоў на сустрэчах з польскімі калегамі мы ўздымалі пытаньне пра яе вяртаньне, аднак покуль што ў музэй перададзеная толькі копія вышэйзгаданага запісу — але ж у кнізе, акрамя яго, сотні іншых запісаў таго часу. Уявіце, які гэта матэрыял для навукоўца, што вывучае эпоху Міцкевіча! Або гісторыя з партрэтамі зь Нясьвіжу, якія ў 1950 г. «падаравалі» Польшчы (пасьля сыгналу з Масквы). Прычым, як ня дзіўна, партрэты дзеячаў, што пакінулі больш значны сьлед у гісторыі Польшчы, засталіся тут, а выявы дзеячаў украінскае і беларускае гісторыі — перадалі палякам, што сьведчыць пра неабазнанасьць чалавека, які займаўся гэтай справай.

«НН»: Дагэтуль гаворка йшла пра нашыя матэрыялы ў замежных архівах. А ці ёсьць у нашых архівах замежныя матэрыялы, якія трэба вярнуць?

А.М.: Вядома, у беларускіх архівах ёсьць матэрыялы, якія трапілі туды памылкова (такая блытаніна часта выклікалася тым, што пасьляваеннай рэстытуцыяй каштоўнасьцяў, вывезеных у Нямеччыну, займаліся людзі без належнае адукацыі — звычайныя салдаты і афіцэры). Я лічу, што такімі дакумэнтамі трэба абменьвацца. Так, нядаўна мы перадалі Ўкраіне некалькі кніжак з асабістае бібілятэкі Пятлюры, ёсьць, безумоўна, і іншыя, аднак адшукаць іх па штэмпэлях — вельмі цяжка. Вырашаецца таксама пытаньне аб перадачы ўкраінскім бокам у Беларусь бібліятэкі Храптовічаў, вывезенай са Шчорсаў напярэдадні І сусьветнай вайны. Праўда, справа затрымліваецца, бо ўкраінцы сьцьвярджаюць, што бібліятэка зьяўляецца падарункам уладальнікаў, тады як дакладна вядома, што яна была перададзеная Кіеўскаму ўнівэрсытэту з-за пагрозы нямецкага наступу з пажаданьнем уладальнікаў, каб матэрыялы былі вернутыя першай жа вышэйшай навучальнай установе, створанай на радзіме.

«НН»: Якую ролю, на Вашу думку, у пытаньнях рэстытуцыі павінна адыгрываць дзяржава?

А.М.: Беларусь — адзіная ў Эўропе краіна, якая ня мае асобнага дзяржаўнага органу, што займаўся б пытаньнямі захаваньня і вяртаньня культурных каштоўнасьцяў. Я супраць нагрувашчаньня новых бюракратычных структураў, але такая інстытуцыя павінна быць. Можа, нават дастаткова будзе аднаго чалавека, скажам, дарадцы пры прэзыдэнце (ці прэм'ер-міністры) па пытаньнях рэстытуцыі — як у ЗША. Мо тады б мы так бяздумна не аддавалі тое, што — безумоўна, справядліва — канфіскуецца на мяжы. Зь іншага боку, быў бы дзяржаўны орган — было б і больш трывалае фінансаваньне праграмаў, зьвязаных з захаваньнем і вяртаньнем здабыткаў.

Гутарыў Андрэй Скурко

ФАЛЬВАРАК МІГАЎКА



На гэтым узгорку 60 гадоў таму стаяла хата Ўласавых.

Ёсьць такі рэдкі тып людзей, да якіх пранікаесься сымпатыяй ужо завочна. Дастаткова нейкай гісторыі з жыцьця альбо аднаго фотаздымка, і ўжо ніякая розьніца ў эпохах не адыгрывае ролі. І хай сымпатычны табе чалавек сышоў задоўга да твайго нараджэньня, цябе ўсё адно прывабліваюць тыя мясьціны, дзе ён жыў і дзейнічаў. І дзе, дзякуючы ягонай колішняй прысутнасьці, усё павінна быць крыху ня так, як паўсюль. Рукапісы гараць, людзкая памяць сьціраецца, але нешта ня можа не застацца. Лягчэй за ўсё назваць гэтае «нешта» аўрай. Але мне здаецца, у нашым выпадку гэта — Беларусь, пра якую мы марым, працягваючы мары й справы тых, хто верыў у яе задоўга да нашага прыходу.

Зьміцер БАРТОСІК

Асобаю першага рэдактара-выдаўца «Нашай Нівы», пасьля — сэнатара польскага сэйму і заснавальніка Радашкавіцкай беларускай гімназіі я ўпершыню пазнаёміўся на старонках рамана Якуба Коласа «На ростанях». З той кніжкі шмат чаго пасьпеў забыцца, але толькі не эпізод зьяўленьня Аляксандра Ўласава, у Коласавым варыянце — Мікіты Ўласюка.

«Якраз у самы разгар Ясевага ўзьнёслага красамоўства з другіх дзьвярэй высунуўся Мікіта Аляксандравіч, босы, у адной толькі ніжняй кароценькай сарочцы. Уся яго постаць нагадвала дзябёлую чыгунную тумбу. Нельга было бязь сьмеху глядзець на гэтую амаль зусім голую фігуру. Пад носам Уласюка красаваліся навусьнікі, канцы якіх былі завязаныя на патыліцы. Такі «ўрачысты» выхад рэдактара абразіў эстэтычны густ Яся Ліскоўскага (Івана Луцкевіча. — *З.Б.*). Нічога ня кажучы, ён шпарка выйшаў у свой пакой, зьняў са сьцяны адну са старасьвецкіх шабель. Не вымаючы клінка, пляснуў разоў пару ножнамі па рэдактарскаму заду. Рэдактар ніколечкі не пакрыўдзіўся і толькі сказаў: — Не паненкі ж тут сядзяць! — павярнуўся і пайшоў у свой пакой. Там у яго былі гіры і штанга, і ён прыступіў да гімнастычных практыкаваньняў, а потым заняўся туалетам.»

Гэты эпізод з раману «На ростанях» узяты зь віленскага пэрыяду жыцьця рэдактара «Нашай Нівы» Аляксандра Ўласава. Колькі пасьля я ні чытаў пра гэтага вусатага велікана, які з усьмешкаю пазірае зь любога фотаздымку, сымпатыі да яго толькі большала. Вось што ўспамінае пра Ўласава ягоная пляменьніца Вера Ніжанкоўская. Тут ужо дзея адбываецца ў Мігаўцы — фальварку непадалёк ад Радашкавічаў: «Калі было горача, дзядзька хадзіў у адных шортах (тады гэта была рэдкасьць), а такі волат, як ён, выглядаў досыць арыгінальна. Нават здараліся зь ім анэкдоты. Прыехаў нейкі беларус з ваколіцаў Вільні й пайшоў зь дзядзькам у сад. Тым часам прыйшоў нейкі селянін па раду. Яго паслалі ў сад, але ён хутка вярнуўся перапалоханы ды кажа: «Там нейкі голы вар'ят ходзіць, а каля яго, мусі, фэльчар круціцца і ўсё яго ўгаворвае!» Аднаго разу прыйшла нейкая дзяўчына, і яе паслалі ў сад. Яна пайшла й паклікала: «Пан сэнатар!» І раптам пачула аднекуль з гары: «Гоп, гоп!» Узьняла галаву, а на дрэве нейкае вялізнае, праве, голае цела. Ад нечаканасьці амаль не самлела».

Вёска Мігаўка, дзе прайшлі апошнія гады Аляксандра Ўласава, ляжыць адразу за Радашкавічамі, калі ехаць зь Менску Старавіленскім трактам. Ад шашы да вёскі вядзе грунтоўка, шляхетна абсаджаная таполямі. На гэтыя прысады міжволі зьвяртаеш увагу як на жывую прыкмету колішняй, несавецкай тэрыторыі.

Я вельмі шкадую, што ня збочыў на Мігаўку выпадкова. Напрыклад, напіцца вады, ці купіць малака. Я б усё роўна пагрукаў у самую старую хату. А насустрач мне выйшаў бы стары хутаранін. Твар, пастава і гаворка якога ўсё роўна прымусілі б мяне затрымацца ў Мігаўцы крыху долей, чым толькі для каштаваньня вады зь мясцовае крыніцы. Карэнная беларуская шляхетнасьць, не прыдбаная з кніжак, а перададзеная з крывёй, адклікалася ў кожным позірку, жэсьце ды слове прыгожага чалавека зь нямецкім прозьвішчам Шнэйдэр і беларускім імем Міхал. «У Беларусі, — ён сказаў, — не прынята па отчеству».

— Уласава? Вядома, памятаю. Росту прыкладна — мэтар дзевяноста. Сама яго рука — далонь узяць — дык нармальнага чалавека слажыць дзьве далані. Сілішчы быў незвычайнай. Памятаю, рэзалі бярвеньні на дошкі. Козлы былі высачэнныя. І калі трох парабкоў не маглі калоду падняць туды, дык ён кажа: «Вы адыдзіцеся, хлопцы». І адзін закінуў тую калодку. Жыў ён вунь на тым узгорку. Хата была прыкладна дзесяць на чатырнаццаць. Але на ўласны конт эканамічаскі ня быў заінтарасаваны. За свае

Аляксандар Уласаў (1874-1941)

Указальнікі старой дарогі на Вільню можна чытаць, як кнігу.



Міхал Шнэйдэр адзін зь нямногіх, хто памятае Ўласава.

крэўныя ладзіў вечарыны, пастаноўкі. Каб, ну як гэта сказаць, мець задавальненьне сабе й сялянам. Прама на ўласным падворку. Як апранаўся... Ён не любіў гальштучка. Кашуля там прырасшпіленая, ці жакетка. Яго за гэта не любілі некаторыя памешчыкі, за гэтую «паказуху». За гэты стыль адзежы, сялянскі. Хоць усе гімназіі, каторыя на тэрыторыі Беларусі існавалі, былі пад ведам яго. Тое, што ў яго ў мысьлях было, тое і ў практыцы рабіў. Калі яго забралі ў трыццаць дзявятым... Тады кожны глядзеў, каб на высылку не папасьціся, ці каб уночы не прыехаў варанок. Мы й да іх прыходу ведалі, чым пахне сталінская свабода. А як яны перайшлі граніцу, мы ўсе былі падаўлены маральна. Хто хадзіў пад гальштучком, дык пачалі скідаць.

Я слухаў колішняга сына арандатара, колішняга варшаўскага студэнта, падпісанта «Ле Фігаро», стажора ў гітлераўскай Нямеччыне. Колішняга сталінскага вязьня, колішняга пчаляра. І заўсёднага беларуса. «Вы не сумуеце па тым шчасьлівым часе?» — «Па часох сумуюць толькі няверуючыя». Я яму паверыў. На разьвітаньне стары мне паціснуў руку. Поціск рукі быў нечакана моцны для чалавека такога веку. Міхалу Шнэйдэру 84.

Аднаго я зразумець ня мог. Стары мне расказваў, што ў Мігаўцы цудоўна ведалі пра парадкі па той бок мяжы. Уцекачоў са сталінскага раю з кожным годам большала. Дык няўжо Ўласаў не даваў ім веры? Ці, можа, хавацца й панікаваць было не ў ягоных правілах? Вось, як выглядае фатальны верасень ва ўспамінах Веры Ніжанкоўскай: «17 верасьня 1939-га, калі ў Радашкавічы прыйшла Красная Армія, ён прыйшоў да мяне поўны энтузіязму, маўляў, вось калі ён будзе пісаць і друкавацца як эканаміст! Аляксандар Мікітавіч паехаў у Маладэчна прапанаваць свае паслугі ў рэдакцыю тамтэйшай газэты. Стуль яго накіравалі ў НКВД на зацьверджаньне, як супрацоўніка. У НКВД яго папрасілі напісаць аўтабіяграфію. Дзядзька на 17-ці старонках апісаў усе свае заслугі ў беларускім і рэвалюцыйным руху... З НКВД ён ужо ня выйшаў і, здаецца, напісаная ім аўтабіяграфія фігуравала як акт абвінавачаньня... Калі жонка вазіла яму ў Маладэчна падаянкі й пыталася ў турэмнага вартаўніка, ці здаровы ейны муж, той адказваў: «Такі вялікі, вусаты? Дык жа ад ягоных расказаў рагоча ўся камэра!»

Я ўзьняўся на той пагорак, дзе стаяць ужо іншыя пабудовы і толькі старыя дрэвы нагадваюць пра абрыс былое сядзібы заснавальніка «Нашай Нівы». Адна карціна прамінулага часу намалявалася маёй фантазіяй так ярка, нібы я быў сьведкам. Летняе зьмярканьне. Ружовае беларускае сонца паволі хаваецца ў заходніх лясах. Зь вялікага падворку пана сэнатара ва ўсе стораны разносіцца «Чаму ж мне ня пець». Падтрыманая гаспадаром дому, песьня сьпяваецца лёгка, на поўны голас. Каб песьню гэтай зямлі на гэтай зямлі чуваць было як мага далей па абодва бакі мяжы. Польскія памежнікі на хвілю адарваліся ад прэфэрансу, расейскія жаўнеры, парушаючы правілы маскіроўкі, закурылі папяросы. Да верасьня засталося ня так і шмат часу. Але ўсім здаецца, што песьня будзе гучаць бясконца. «Калі ў нашай хатаньцы парадак ідзець»...

■

ТЭМА

ДЫЯКСЫН

Дыяксын у курыных яйках, курыным і сьвіным мясе... Дыяксын стаўся ўжо ня толькі бэльгійскай праблемай, але праблемай усяго Эўрапейскага Зьвязу, праблемай Эўропы цалкам.

«Бэльгійскі выпадак» можна вытлумачыць нядбайнасьцю пэрсаналу, зьбегам акалічнасьцяў, проста выпадковасьцю, на якую ня трэба зьвяртаць увагу.

Але, на жаль, катастрофы і атручваньні, выкліканыя альбо выкідам дыяксыну ў атмасфэру альбо забруджваньнем дыяксынам вады ці ежы, адбываюцца з жахлівай рэгулярнасьцю. Чаму?

Дэмаграфічны выбух, сталае павелічэньне патрэбаў у сродках харчаваньня, рост хімічнай прамысловасьці, хімізацыя сельскай гаспадаркі сталіся чыньнікамі, з-за якіх чалавек часьцей стаў сутыкацца з чужароднымі хімічнымі злучэньнямі, якія не сустракаліся яму раней пад час эвалюцыі, — так званымі «ксэнабіётыкамі».

Паводле зьвестак САЗ (Сусьветнай Арганізацыі Здароў'я, WHO), колькасьць ксэнабіётыкаў сягае сёньня 6 млн. найменьняў, сярод якіх больш за 500 нават у мінімальных дозах выклікаюць цяжкія атручваньні чалавека й жывёлаў. Крыніцамі пападаньня ксэнабіётыкаў у біясфэру — паводле эколягаў — маюць быць:

прамысловыя адкіды;

пэстыцыды (інсэктыцыды, гербіцыды, дэфаліянты);

нафтавыя прадукты;

выкідныя газы аўтатранспарту і самалётаў;

неўтылізаванае сьмецьце;

адкіды атамнай прамысловасьці і радыёактыўныя ападкі;

лекавыя прэпараты, харчовыя дадаткі (антыаксыданты, фарбавальнікі і г.д.);

касмэтычныя сродкі.

Адным з найбольш небясьпечных ксэнабіётыкаў зьяўляецца дыяксын. Што ж такое дыяксын і чаму ён ёсьць такім небясьпечным?

Так выглядае структура 2,3,7,8-тэтрахлёрдыбэнза-n-дыяксыну.

Хімічная будова

Дыяксыны — агульная назва групы поліхлёраваных араматычных вуглевадародаў. Усяго вядома 210 прадстаўнікоў групы дыяксынаў, сярод якіх вылучаюць поліхлёраваныя дыбэнзадыяксыны (ПХДД, вядома 75 рэчываў) і поліхлёраваныя дыбэнзафураны (ПХДФ, 135 рэчываў).

Найбольш вядомым прадстаўніком групы дыяксынаў ёсьць 2,3,7,8-тэтрахлёрдыбэнза-n-дыяксын (ТХДД), які найчасьцей называюць проста «дыяксын» альбо ў эўрапейскім навуковым ужытку «Seveso-Dioxin» па назве горада Сэвэза ў Італіі, дзе 10 ліпеня 1976 году адбылася аварыя на прадпрыемстве па вытворчасьці гербіцыдаў, у выніку якой у паветра было выкінута каля 4000 г ТХДД, што прывяло да забруджваньня 1300 га зямлі. З-за высокай хімічнай стабільнасьці дыяксын (ТХДД) належыць да найбольш небясьпечных забруджвальнікаў і лічыцца «супэратрутай» (ён амаль што ў 1000 разоў больш атрутнае рэчыва, чым цыяністы каль).

У структуры ТХДД (гл. малюнак) 2 бэнзольныя кольцы, утвораныя 12 атамамі вугляроду, зьвязаны паміж сабой праз 2 мосьцікавыя атамы кіслароду (дыяксынавая стуктура). Атамы хлёру могуць замяшчаць атамы вадароду, зьвязаныя з вугляродам бэнзольных калец. У ТХДД хлёр замяшчае вадарод у пазыцыях 2,3,7,8. Таму назва гэтага дыяксыну — 2,3,7,8-тэтрахлёрдыбэнза-n-дыяксын.

ТХДД адпавядае брута-формула $C_{12}H_4O_2Cl_4$, якую могуць мець 22 ізамэры — рэчывы, якія адрозьніваюцца прасторавым спарадкаваньнем атамаў і сувязьзю між імі. Але толькі адно рэчыва з гэтых 22 ёсьць менавіта ТХДД. Фураны адрозьніваюцца ад дыяксынаў толькі тым, што маюць у сваім складзе толькі адзін мосьцікавы атам кіслароду.

Адкуль бярэцца дыяксын

Дыяксыны ніколі не выраблялі наўмысна. Яны ўтвараліся як пабочныя прадукты працэсаў у хлёрарганічным сынтэзе (вытворчасьць гербіцыдаў, сродкаў для апрацоўкі і захаваньня драўніны і г.д.), у галіне высокатэмпэратурнай апрацоўкі мэталю і іншых вытворчасьцях, дзе высокія тэмпэратуры. Акрамя таго, значная колькасьць дыяксыну трапляе ў атмасфэру пры спальваньні звычайнага сьмецьця, сярод якога сустракаюцца рэчы, выраблены з полівінілхлёрыду (ПВХ) і іншых хлёрыстых рэчываў. Штогод толькі ў Нямеччыне з-за гэтага ў атмасфэру трапляе больш за 4000 г ТХДД (гэта больш за колькасьць, выкінутую ў Сэвэза).

Узьдзеяньне на чалавека

Пры атручваньні дыяксынам спачатку выяўляюцца неспэцыфічныя сымптомы: раздражненьне вачэй, носу, галавакружэньне, млосьць, ваніты. Далей у месцы кантакту з дыяксынам на скуры зьяўляюцца пачырваненьні і пухліны.

Нават у невялікай колькасці дыяксын здольны выклікаць пашкоджаньне печані, сэрца, нэрвовай сыстэмы, галаўныя болі, імпатэнцыю, распад асобы, дэпрэсію з суіцыдальным вынікам.

Асабліва небясьпечным ёсьць павышанае ўтрыманьне дыяксыну ў малацэ маці.

Лічыцца, што й невялікая колькасьць дыяксыну здольная выклікаць рак («канцэрагенная здольнасьць»).

Паводле зьвестак САЗ, ужываньне больш за 4 пікаграмы (пікаграм = 10-12 г) дыяксыну на кіляграм вагі ўжо можа выклікаць шкодныя вынікі для здароўя.

Якія зьмены ў здароўі чалавека зьвязваюць з дыяксынам?

Колькасьць спэрмы ў мужчын зьменшылася на 50% за апошнія 50 гадоў;

колькасьць выпадкаў раку прастаты падвоілася за апошнія 50 гадоў;

у 1960 г. кожная дваццатая жанчына мела верагоднасьць захварэць на рак малочнай залозы, сёньня — кожная восьмая.

Дыяксын у штодзённым ужытку

Паводле зьвестак САЗ, жыхары экалягічна забруджаных раёнаў штодзённа атрымліваюць зь ежай каля 20 пікаграм дыяксыну на кілё вагі. Немаўля атрымоўвае з малаком маці ля 350 пікаграм дыяксыну на кіляграм. Таксыколягі лічаць, што на працягу жыцьця мы атрымаем ля 440 000 пікаграм дыяксыну. Дзьве траціны з гэтага прыпадае на малочныя прадукты, рыбу і мяса. Дыяксын зьяўляецца гідрафобным рэчывам (не расчыняецца ў вадзе), але ён вельмі добра расчыняецца ў тлушчы. Па законах ланцуга сілкаваньня, найбольш дыяксыну ўтрымліваюць у сабе рыба і хатняя жывёла, высокатлустыя вырабы з малака. Пры гэтым колькасьць утрымліванага дыяксыну прапарцыянальная ўзросту жывёлы — чым старэйшая, тым больш.

Жывёлы атрымліваюць дыяксын з травы, паветра (выхлапныя газы аўтатранспарту, выкіды прадпрыемстваў) і — большую частку — з кармоў, для вытворчасьці якіх выкарыстоўваецца менавіта тая частка зерня, якая ўтрымлівае найбольш вялікую колькасьць дыяксыну.

Менавіта з выкарыстаньнем забруджаных кармоў зьвязаны сёньняшні дыяксынавы скандал у Бэльгіі. Выпадкова здарылася так, што цыстэрна, у якой перавозілі тлушч для вытворчасьці кармоў, аказалася недастаткова вымытай ад рэштак мінэральнага масла з дыяксынам. З-за гэтага дыяксын трапіў у кармы, а надалей і ў мяса.

Як пазьбегнуць дыяксыну

Есьці менш сьвініны і ялавічыны (найвышэйшая канцэнтрацыя дыяксыну), рачной рыбы, сыру, масла, марозіва, прадуктаў, прыгатаваных з выкарыстаньнем тлушчу (прыкладам, чыпсаў);

абмежаваць ужываньне марской рыбы, курэй, вінаграду;

есьці: тофу, рыс, боб, фасолю;

піць малоко з малым утрыманьнем тлушчу;

для цяжарных жанчын: як мага абмежаваць ужываньне прадуктаў з высокім утрыманьнем тлушчу;

пазьбягаць арганічных «хлёра»-злучэньняў (пэнтахлёрафэнол — сродак для захаваньня воўны; гіпахлярыд натру — адбяляльнік);

выкарыстоўваць паперу, адбеленую ня «хлёравымі» адбяляльнікамі;

не выкарыстоўваць «хлёравых» інсэктыцыдаў (хлёрафэнол, «Permethrin»);

пазьбягаць вырабаў з ПВХ (полівінілхлёрыду), лінолеуму;

мыць садавіну і гародніну (бо на іх могуць сядаць пэстыцыды);

не выкарыстоўваць мыла, прыгатаванага з жывёльнага тлушчу (амаль што ўсё мыла), дэзадарантаў з «triclosan»-ам («трыклязан» = хлёрфэнол). ■

НАЙБУЙНЕЙШЫЯ СКАНДАЛЫ, ЗЬВЯЗАНЫЯ З ДЫЯКСЫНАМ

Віетнам, 1962—1970
У напальмавай вайне супраць Віетнама ЗША выкарыстоўвалі сродак «Agent Orange». Вынік — тысячы атручаных людзей і 2 мільёны гектараў забруджанай тэрыторыі. Дагэтуль дыяксын знаходзяць у амэрыканскіх лётчыкаў, якія ваявалі ў Віетнаме.

Сэвэза, Італія, 10 ліпеня 1976
Выкід 4000 г дыяксыну з фабрыкі. Праз 4 дні пачаліся захворваньні сярод людзей, птушкі валіліся зь неба, паміралі каты. Раён быў эвакуяваны. 84 гектары зямлі і сама фабрыка дагэтуль зьяўляюцца закрытай тэрыторыяй. Колькасьць ахвяраў невядомая дагэтуль.

Тэкамторп, Швэцыя, кастрычнік 1977
Фабрыка канцэрну «Sadolin» у горадзе на поўдні Швэцыі выпусьціла атручаную ваду ў рэчку. Пасьля пачатку захворваньняў усе жыхары лакінулі мясцовасьць.

Таймз Біч, Місуры, ЗША, люты 1983
У 1973 годзе ў навакольнае асяродзьдзе было выкінута 10 кг дыяксыну. Сьмяротнае ўтрыманьне дыяксыну ў вадзе й глебе было адкрытае выпадкова. Эвакуяваныя 2400 чалавек.

ФРГ, люты 1984
Дасьледаваньне пра ўтрыманьне дыяксыну ў малацэ маці. Пасьля рэпартажу ў тэлевізійнай праграме «Monitor» рэзка паменшылася колькасьць нараджэньняў.

Карара, Італія, сакавік 1984
На хімічнай фабрыцы «Anic Agricultura» адбыўся выкід дыяксыну ў паветра. Грамадзкасьці пра гэта стала вядома толькі праз два тыдні.

Брандэнбург, ФРГ, ліпень 1996
У адкідах ачыстных збудаваньняў ля бэрлінскага аэрапорту Шонэфэльд знойдзена 125 мкг дыяксыну на кожнае кілё. Агульная вага гэтых адкідаў — 16 000 тон.

Сыэтл, ЗША, ліпень 1997
Выкарыстаньне атручанага хімічнага сродку для аховы расьлін выклікала забруджаньне зерня, а таксама жывёлаў, якія яго ўжывалі.

Дуйсбург, ФРГ, сакавік 1999
Празь фільтравальныя збудаваньні рэцыклінгавай фірмы «B.U.S. Berzelius» прайшло ля тоны пылу, які ўтрымліваў дыяксын. Грамадзкасьць была праінфармаваная толькі праз тры дні. ■

тыдзень з прафэсарам Каркаранам

«БАЦЬКА ЭКАЛЁГІІ» І ТАЯМНІЦА СУСЬВЕТУ

Сто гадоў таму біёляг Эрнст Гекель (Ernst Haeckel) канчаткова — на яго думку — разьвязаў таямніцу Сусьвету. Увосені 1899 году з друку выйшла кніжка пад найменьнем «Сусьветныя загадкі» («Die Welträthsel»), якую Гекель лічыў найважнейшай працай свайго жыцьця. У ёй Гекель падагульніў вынікі разьвіцьця навукі за мінулыя часы і фактычна сфармуляваў сьветапогляд навукоўца надыходзячага стагодзьдзя. Пра што ж пісаў Гекель?

Даказваў адзінства матэрыі і духу, даказваў, што Сусьвет, рэальнасьць — матэрыяльная і духоўная — існуе і кіруецца аднолькавымі законамі, і яе разьдзяленьне на прыроду і дух, як гэта робіць хрысьціянства, зьяўляецца цалкам памылковым; адмаўляў у навуковасьці бяздоказным сьцьвярджэньням, адмаўляў існаваньне Бога, свабоднай волі і несьмяротнай душы; пісаў, што «рэлігія для мяне — гэта глыбокае пачуцьцё зьдзіўленьня, калі я назіраю цуды матэрыяльнага сьвету».

Эрнст Гекель, «нямецкі Дарвін», быў адным з найбольш вядомых і ўплывовых навукоўцаў свайго часу. Больш пасьлядоўны і катэгарычны дарвініст, чым сам Дарвін, Гекель быў упэўнены у прыродным паходжаньні чалавека, ён увёў у навуковы ўжытак тэрміны «філягенэза» і «онтагенэза». Менавіта пад уплывам працаў Гекеля галяндзец Этэн Дзюбуа накіраваўся на Яву, дзе знайшоў рэшткі пітэкантрапа, што сталася адным з найважнейшых доказаў эвалюцыйнай тэорыі.



Біёляг Эрнст Гекель быў адным з найбольш вядомых і ўплывовых навукоўцаў свайго часу.

Але Гекель ня гэтым увайшоў у гісторыю навукі. У 1866 годзе Гекель у трактаце «Ўсеагульная марфалёгія» ўпершыню ўжыў тэрмін «экалёгія» ў значэньні «агульная навука аб адносінах арганізмаў з навакольным асяродзьдзем».

Ужо з пачатку XX ст. пачынаецца імклівае разьвіцьцё экалёгіі:

1913 год — выходзіць з друку манаграфія Ч.Эдамза «Кіраўніцтва да вывучэньня экалёгіі жывёлаў»;

1914 год — заснаваная Брытанская экалягічная суполка, упершыню ўжыты тэрмін «экалёгія чалавека»;

1916 год — заснаваная Экалягічная суполка Амэрыкі;

1920 год — выйшаў першы нумар часопіса «Ecology»...

Канец 60-х — пачатак 70-х гадоў нашага стагодзьдзя лічацца пачаткам так званага «экалягічнага буму». Чыньнікамі, якія спрыялі гэтаму, сталіся:

- адносна высокі і стабільны ўзровень жыцьця, людзі сталі больш увагі надаваць свайму здароўю і якасьці навакольнага асяродзьдзя;
- папулярызацыя думкі, што забруджваньне навакольнага асяродзьдзя ставіць пад пагрозу існаваньне чалавека;
- удасканаленьне мэтадаў кантролю і канстатацыя незваротных зьменаў у біясфэры («парніковы эфэкт», «азонавая дзірка»).

Але — як гэта заўсёды бывае — папулярызацыя экалёгіі прывяла да яе трансфармацыі ў паспалітай сьвядомасьці ў «магію». Мэтады дасьледаваньня, навуковая аргумэнтацыя, доказы замяняюцца «магічнымі заклікамі» — «беражыся, дыяксын, азон, радыяцыя!..» Словазлучэньні «экалягічна чысты», «экалёгія чалавека», «экалягічны кантроль», «экалягічная тэхналёгія» вельмі часта можна сустрэць на старонках газэт, але ці разумее хто-небудзь, ШТО гэта азначае? Пра гэта мы пагаворым, а пачнем з такога небясьпечнага забруджвальніка як дыяксын.

На жаль, «магічная экалёгія» гэтак жа сама адрозьніваецца ад экалёгіі, як астралёгія ад астраноміі. Сьвятло нараджае цень, але ніколі не бывае наадварот. ■

больш інфармацыі да тэмы:

ДЫЯКСЫН
Дыяксын. Хімічныя катастрофы. // Химические катастрофы и экология / Ю.Губский, В.Долго-Сабуров, В.Храпак. — Київ: Здоров'я, 1993. — 224 с.
http://www.enviroweb.org/enviroissues/dioxin/index.html
http://www.cqs.com/edioxin.htm
http://www.geocities.com/Athens/1309/

ЭРНСТ ГЕКЕЛЬ
http://www.geschichte.2me.net/dch/dch_2063.htm
http://www.madinfo.pt/organismos/ceha/ecologia/249.htm
http://www.ucmp.berkeley.edu/history/haeckel.html
http://www.nceas.ucsb.edu/~alroy/lefa/Haeckel.html
Поўны тэкст манаграфіі «Die Welträthsel»
http://www.mpiz-koeln.mpg.de/~stueber/haeckel/weltraethsel/

Малюнак Веры Лабко.

Андрэй Аляксандраў

* * *

Іду па шпалах,
хоць гэта нязручна.
Іду
і мераю крокамі рэйкі.
А мне насустрач
з лаянкай гучнай
ляціць цягнік
мэталёвай зьмейкай.

Ні ён, ні я
не жадаем збочыць;
у нас абодвух –
жалезны прынцып.
Адзін адному
глядзім у вочы
з вар'яцкаю прагаю
насьмерць біцца.

Ідзем сам-насам,
кроў супраць жалеза,
і кожны верыць
ў сваю перамогу.
За сьпінамі мы пакідаем межы,
бязглуздыя межы жыцьця старога.

Апошнія крокі
крычаць у бязгуччы.
Чырвоны скрыгат
заліў нябёсы.
Я йду па шпалах,
хоць гэта нязручна,
а мёртвы цягнік
ляжыць пад адкосам...

Алесь Аркуш

ВАВЭЛЬ

Каля абарончых муроў Вавэля бутафорскі дракон
пэрыядычна
дыхае полымем у бок Віслы,
але зусім ня страшна
нават маленькім дзецям,
якія са сьмехам абступілі страшыдлу,
як факіра на сьвяточным кірмашы.
Я зноў блукаю ля тваіх муроў – Вавэль,
здаецца, ведаю цябе зь сівой даўніны
столькі ж, колькі гэтыя *Лагоні* на тваіх
брамах і сьценах.
Скачуць вершнікі да роднага Полацку,
нясуць весткі з Вавэля –
не загады, бо ня любіць Полацак загадаў, –
толькі весткі пра інтрыгі, балі і фаварытаў,
альбо просьбы аб вайсковай дапамозе;
ня шмат тваіх слаўных сыноў, Полацак,
наведвалі гэтыя шыкоўныя залі,
ступалі на гэты ганаровы брук,
дзівіліся з гэтых шэдэўраў-габэленаў,
якімі шчодра завешаны сьцены палацу;
а хто і патрапляў сюды,
на вочы караля суседняе краіны,
ці заўсёды ён памятаў пра цябе,
вялікі Полацак?
Ці не асьляпляла яго багацьце
і пашанота двара манарха?
Ці не прачыналася тут, сярод бляску
і велічы, пачуцьцё зайздрасьці і сваёй
непаўнавартасьці?
І тады, забыўшыся пра гонар,
сьпяшаліся зайздросьнікі засьведчыць
сваю адданасьць чужому каралю,
зракаліся сваіх звычаяў, традыцыяў, мовы,
забыўшыся пра цябе, Полацак.
Быў у нашых краёх, прынамсі, адзін палачанін,
які выправіўся юнаком у далёкі Кракаў,
звалі яго Францішак;
толькі не блукаў ён па каралеўскіх залях,
не разглядваў біблійных сюжэтаў
на вялікіх – на ўсю сьцяну – габэленах,
не частаваўся смажанай алянінай са стала манарха
– па веды выправіўся ў чужаніцу Францішак.
Я ступаў на тыя самыя сходы,
па якіх хадзіў дапытлівы палачанін,
гукаў у тыя самыя сугарэньні,
якія памятаюць голас юнака зь берагоў Дзьвіны,
дакранаўся да сьценаў храму навукі,
якія захоўваюць цеплыню ягоных далоняў,
пытаўся ў прафэсараў: як пабачыць земляка?
Ды ніхто ня ведаў – толькі паціскалі ў адказ
плячыма.
Усё адно я знайшоў яго.
На хвіліну Скарына адарваўся ад пільнага занятку
і, як сучасны кампутар, імкліва счытаў з майго
твару
апошнія навіны з Бацькаўшчыны.
Ня буду доўга замінаць, дружа Францішак,
о! колькі напрадзе ў нас працы!
Да пабачэньня! Плёну дзеля велічы роднага
Полацку!
А я сёньня адпачываю.
Вечарам зь сябрам выправімся
ў містычную рэстарацыю «Ружы і кроў»,
дзе замовім чырвонага віна,
якое, перш чым наліць у нашыя фужэры,
даюць пакаштаваць на смак.
Мы вып'ем за Полацак і за тваё здароўе, дружа
Францішак!
Я буду па-беларуску
апавядаць сябру пра чароўнае месца,
дзе Палата сустракаецца зь Дзьвіною,
дзе Ян Баршчэўскі напаткаў свае фантастычныя
прыгоды,
дзе Ластоўскі шукаў таямнічыя лябірынты...
Мой суразмоўца, які ніколі ня быў у Полацку,
будзе ветліва слухаць,
часам незаўважна пакідаючы цьмяную залю-
сутарэньне
дзеля якіхсьці тэрміновых развагаў і думак.
Я гатовы апавядаць гэтым сьценам, манэкену
мніха,
які стаіць за маёй сьпіной,
і нетаропкай афіцыянтцы...

Заўтра Вавэль будзе такім самым, якім памятаю
яго зь мінуўшчыны,
і пазаўтраму, і праз год, і праз стагодзьдзе,
і толькі Полацак будзе мяняцца:
адновіцца ўнівэрсытэт, вярнуўшыся ў муры
былога Езуіцкага калегіюму,
адбудуецца сабор сьвятога Стэфана,
паўстануць помнікі героям, якія праславілі места,
народзіцца пантэон выбітных людзей Краіны,
а пад старажытнымі скляпеньнямі ўнівэрсытэту
зноў галава Дзядка, якая ўмее гаварыць на тузіне
эўрапейскіх моваў, будзе даваць парады
полацкім шкалярам.
Калі ты прыедзеш адпачыць да нас у Полацак,
я абавязкова зваджу цябе да гэтай разумнай
галавы,
каб ты сам-насам запытаўся ў яе пра ўласнае
патаемнае,
пасьля чаго я правяду цябе па полацкіх лёхах
да самых Бельчыцаў,
дзе мы зойдзем у рэстарацыю «Ў братоў
базылянаў»,
замовім чырвонага віна і вып'ем за цябе, Вавэль!

Вольга Базылёва

ВЯРТАНЬНЕ ДА СЯБРОЎ

І зноў я тут, такая, як заўжды,
Зь зялёным лісьцем веснавых вачэй.
Пад сонцам люстраных аранжарэй
Страсаю спарахнелыя лісты.
І зноў я тут, сярод чужых сваіх,
Давер раздорваю і рассыпаю згоду.
Сьцябліны дамарошчаных істотаў
Сьляпым пытаньнем адганяюць іх.
І зноў я тут. Адсюль таптала сьцежку
Ў неба – прыблукала ж на зямлю.
Я тут. Як Данка, сэрца запалю
Дзеля чужой, ды ветлівай усьмешкі.

Алесь Бакач

* * *

Што безвыходней, што яшчэ дурней,
Чым сьмерць чакаць, гадуючы дзяцей,
Якія шлях твой пройдуць ад пачатку,
Жыць для Радзімы будуць і нашчадкаў,
Нарошчваць сала, піць, хварэць бязь меры,
Не зразумеўшы ўрэшце ні халеры,
Хадзячым трупам перад абразамі
Зь нямым зьдзіўленьнем разьвядуць рукамі:
Што безвыходней, што яшчэ дурней,
Чым сьмерць чакаць, гадуючы дзяцей?!

Марта Гамановіч

* * *

Мая чародка шызых галубоў
Схавала непадзельную любоў.
Я клічу іх ды семкамі кармлю,
А ты ўжо тут. А я цябе люблю.
Імя тваё і першага таго –
Адно. А мо ў табе люблю яго?
І так журботна, ды так сьветла жыць.
Нямею, сэрца радасна дрыжыць.
Калі б я ведала – адкуль яно
І неба мне дае, і прорвы дно.
Адказ адзіны – гэта Дух Сьвяты.
Дык хто яго трымае – я ці ты?

ЛЯ ПОМНІКА. ЧАЦЬВЕР
Алесю

Калі б той высокі сышоў, сапраўды, з п'едэсталу,
А гэты маленькі ўзышоў хоць на дзень пастаяць,
Напэўна б, душа галубіная больш пажадала,
Чым гэтых дваіх на ўваскрослай зямлі параўнаць.
Бо ён, галубок дарагі, зь перабітаю лапкай.
Што клікаць к сабе, калі й крошкі ў кішэні няма?
Хутчэй бы дзяцей узрасьціць, ды старэнькаю
бабкай
Карміць гэтых птушак штодня: лета, восень,
зіма...
Калі б той, Паэта, пайшоў бы па роднай
старонцы,
А гэты, Ваяка, на дзень хоць заняў пастамэнт –
Знайшла б я, нарэшце, для беднай зямлі
Абаронцу,
Што й без самагонкі ўжо мае патрэбны акцэнт.

Галіна Казак

КАЗАЧНЫ ГЕРОЙ

Неяк казачным героем ён зьявіўся да мяне,
Шчабятаў мне пра каханьне, быццам у салодкім
сьне,
Зорнай ноччу пацалунак свой агністы падарыў,
Паратунку не шукала, бо ён вельмі смачны быў.
Раптам зорачкай у сэрцы ўзышло маім каханьне,
Ён пакінуў мне надзею на яшчэ адно спатканьне,
Я спыталася нарэшце: Ты мяне не ашукаў?
Бо я з тым ня буду згодна. – У адказ ён
прамаўчаў.
Зорку выхапіла з сэрца ды ўскінула на неба.
Не хачу твайго каханьня, мне хлусьлівае ня трэба.
А прачнулася – мне ў вочы месяц шчыра
ўсьміхаўся,
Нібы зноў у сэрца зорку мне ў маё вярнуць
зьбіраўся.

Алесь Катлянік

* * *

Кахаю цябе.
І аб гэтым – маўчу.
Бо сьвету няўзважна,
Чаго я хачу.
Бо праўдзе тваёй
Не патрэбна мая.
І я ў тваіх клопатах –
Толькі гульня.
Чаму ж ахмяляеш таемным цяплом,
Душу захлынаеш пяшчотным сьвятлом?
Няма паратунку! Да скону ўсяго –
Салодкі мой боль некаханьня твайго.

Вольга Коваль

МАТУЛІ

Ты сонейка маё, якое грэе,
Ты даражэй за ўсіх мне на зямлі.
Як толькі прытулюся да цябе я,
Ты пацалуй, даруй і абдымі.
І не патрэбна болей мне нічога,
Калі ты ёсьць, сядзіш каля мяне.
Штовечар буду я прасіць у Бога,
Каб ён пачуў і дапамог табе.

Вера Ліпская

* * *

Вы бачылі, як памірае агонь,
У танцы апошнім ускідвае крылы?
І ўжо празь імгненьне нязнаная сіла
У змрок Небыцьця ператворыць яго.

Вы бачылі, як памірае агонь,
Што быў у сьцюдзёнай начы ўратаваньнем?
На золку, вітаючы Сонца вяртаньне,
Адзначыць канец існаваньня свайго.

Вы бачылі, як памірае агонь,
Забраўшы лісты ад калісьці каханых,
Старым ці яшчэ не загоеным ранам
Пакінуўшы попелу жменьку ўсяго?

Вы бачылі, як памірае агонь,
Калі дагарае васковая сьвечка?
Душы успамін адлятае ў Вечнасьць.

Вы бачылі, як памірае агонь?

Алег Нікулін

НА ДАРОЗЕ Ў БУДУЧЫНЮ

Не крыўдуйце на нас,
О стыхіі прыроды,
Што імкнемся за час
З усялякай нагоды.

Страшна з вамі было,
Але ж там будзе цесна,
Бо чужое сьвятло
І ня вечнае «чэсна».

Там, за часам, ня мы –
Толькі нашыя целы
І турма для турмы.
Колер брудны, хоць белы.

Тут мы разам – адно,
Там, як ворагі злыя...
Лёгка падаць на дно,
О стыхіі зямныя.

* * *

Разьвітаўшыся зь Менскам калісьці,
Я прарочыў табе, што мы будзем
Для вяртаньня шукаць потым выйсьце,
Што ніколі яго не забудзем.
Менск, як памяць былога каханьня,
Зварушыў нашы сонныя мары,
Мы імкнёмся ізноў да сьвітаньня
Разганяць вечаровыя хмары.
Пацалункам цябе пачастую.
Прасьпяваю забытыя песьні
Пра сталіцу маю дарагую,
Пра спатканьні ў Траецкім прадмесьці.
Горад дзіўны, якому, магчыма,
Даспадобы такія спаткань ні,
Гляне сьветлымі ў бок наш вачыма,
Каб убачыць свае адчуваньні.

Тацяна Хмара

СОН

Курапаты. Вочы ката. А здаля
Бачу крылы, чую голас жураўля,
Кружыць бусел (шчасьце, мусіць, прынясе
Курапатам?). Хтосьці босы на расе.
То ня росы! – проста сьлёзы на траве –
Вочы – стрэлы, вочы – рукі – ў галаве.
Курапаты –
Неба ў высі вісьне –
Кат.
«Ты, дачушка, не глядзі туды...» –
Загад.
P.S. Хто – маліўся,
Хто – сьмяяўся,
Хто – глядзеў...
Выплывае сонца белае з-за дрэў –
Прачнулася.

Аляксей Шыдлоўскі

* * *

Можа быць, гэта проста Вясна
Зноў наклала адбітак на нас?
Можа быць, і каханьня няма
І ўсё гэта толькі на раз?
А пасьля разыдземся ўбакі
І чужымі станем ізноў,
Можа быць, будзе час такі,
Што ня знойдзем у сабе слоў,
Прывітацца каб проста. Што ж,
Калі так, то пасьля – даруй,
Але зараз, вясны ўздоўж
Мы кахаемся напрапалую!

літаратурны сэмінар «Варштаты»

В.Стахіевічу. *Гэта сапраўды экспэрымэнт. Вашыя радкі пра тое, што «сумныя песьні, рыжыя бровы, добрыя словы, чыстыя думкі...» можна прадоўжыць. І атрымаем: «...чыстыя ногі, брудныя ногі, сьвежыя дровы, старыя плесьні, пісаць хочацца, хоць ты трэсьні!»*

Я.Берасьцейскай. *Цяжка расчытваюцца Вашыя тэксты, напісаныя зялёным атрамантам. Як бы гэта выправіць становішча?*

Тацяне Хмары. *«Варштаты» вызнаюць прынцыпы пазытыўнасьці, аптымізму, вітальнасьці, г.зн. прагі да жыцьця й перамогі. Пакуль сьвядомая нацыянальная беларуская сіла ня возьме ў сваёй Краіне ўладу, датуль канца ня будзе ўсім гэтым чарнобылям, курапатам, нямігам ды мікалаеўкам — трагедыям і зьдзекам над нашымі людзьмі. Але няхай не чакае набрыдзь, што мы ўвесь час будзем у жалобе хадзіць! Наша паэзія пачынаецца з уласнага «я», з вышыні, дзе лунаюць арланы, з пушчаў, дзе рысі стаіліся ў шатах, з балотаў, дзе мох такі аксамітны... Адным словам, кінь вечны плач свой аб старонцы!.. І яшчэ: выбірайце каханьне, а вершы — як Бог дасьць.*

Славамір Адамовіч



сто твораў мастацтва XX стагодзьдзя

Кастусь Харашэвіч. ПАСЬЛЯ НАВАЛЬНІЦЫ

Палотны Кастуся Харашэвіча «Паўстаньне нарачанскіх рыбакоў» ці «Выступленьне Браніслава Тарашкевіча перад сялянамі Заходняй Беларусі» — адны з найбольш красамоўных сьведчаньняў штучнасьці тэмаў накшталт «...пад прыгнётам панскім» у нашым мастацтве. Ну ніяк ня вяжацца постаць Тарашкевіча з роляй «чырвонага» агітатара. А колішні страйк дзясятка рыбакоў на Нарачы ніяк не выглядае на паўстаньне, рэвалюцыю ці на што яшчэ падобнага... Нават пры моцнай афіцыёзнай падтрымцы нічога вартага на змагарныя тэмы пра Заходнюю Беларусь гэтак і не нарадзілася. Але нарадзіліся дзясяткі розных палотнаў, у якіх мастакі ставілі перад сабою чыста жывапісныя, фармальныя задачы і пры тым апэлявалі да нацыянальнай сьвядомасьці гледача.

...Сьляпучыя блікі на нарачанскіх хвалях, стракатыя пісягі на вопратках і рыбацкіх сетках, а недзе збоку йдзе сабе польскі паліцыянт... Каб не імпэтны палітычны назоў, гэтае палатно можна было б разглядаць як імпрэсіяністычны экспэрымэнт мастака, блізкі па манеры да расейца Каровіна ці паляка Міскага. І тады палатно мела б іншую трактоўку. Аднак Харашэвіч падкрэсьлівае гістарычнасьць жанру й зьвяртае ўвагу гледача на спэцыфіку нацыянальнай гісторыі, адрознай ад агульнай гісторыі СССР. І насамрэч палотны Харашэвіча ды ягоных калегаў, прысьвечаныя заходнебеларускім матывам, істотна ўплывалі на беларускія пачуцьці. Бо што было, напрыклад, вядома пра Тарашкевіча школьнікам (ды й ня толькі) у 70-я гады?

У 80-я мастак ужо не зьвяртаецца да жанравых кампазыцыяў, пазьбягаючы дыдактычнасьці. Але ён застаўся верны сваім перакананьням мастака-калярыста і беларускага патрыёта. Сюжэты кампазыцыяў Харашэвіча па-ранейшаму прамаўляюць найперш да беларускіх сэрцаў. «Магіла паўстанца», «Дарога ў Гальшаны», «Мой родны кут...». Адны гэтыя назовы выклікаюць у нас асацыятыўны шэраг з рознымі матывамі ў беларушчыне.



Кастусь Харашэвіч (1927, вёска Літва, Меншчына), жывапісец. У 1961 годзе скончыў Менскую мастацкую вучэльню. Цяпер ягоныя творы захоўваюцца ў Беларускай бібліятэцы імя Францішка Скарыны ў Лёндане, Нацыянальным мастацкім музэі Беларусі, Музэі сучаснага выяўленчага мастацтва, а таксама ў прыватных зборах Нямеччыны, Польшчы, Расеі, Ізраілю.

Ягоная жывапісная манера тымчасам, набіраючы досьведу, набрыняла тымі паўтанамі, адценьнямі й сьвятлом, якія можна толькі адчуць. Бо бачачы іх штодня, мы не надаем ім увагі й не пасьпяваем заўважыць. Як пралятае хмара, адкідаючы сваю цень далёка, далёка перад сабою... Як спаўзае на зямлю прыцемак, за хвіліны ахутваючы ўсё навокал... Ці як з апошнім уздыхам перакульваючы нябёсы, сыходзіць навальнічны вецер...

Палатно «Пасьля навальніцы», напісанае ў 1984 годзе, рэпрэзэнтуе той творчы пэрыяд мастака, калі ім быў ужо выпрацаваны ягоны стыль, адметны й дасканалы. Па-ранейшаму ў ім адчувальны ўплыў імпрэсіянізму, магчыма, пэйзажыстаў — Дэрэна альбо Брака. Але, зважаючы на тое, што Харашэвіч, жывучы ў Маладэчне, сьведама вызнае й вычувае сябе як заходнебеларускі мастак, мы мусім шукаць і іншых крыніцаў ягонага досьведу. Бадай, гэта Рушчыц ды Драздовіч. У некаторых работах гэта прасочваецца ўвачавідкі. Дастаткова параўнаць «Пасьля навальніцы» з Рушчыцавымі палотнамі, прысьвечанымі Багданаву. Гэта і «Гняздо», і «Стары дом» ды іншыя.

Аднак ідзецца не пра прамыя цытаты ці беспасярэдняе паслугоўваньне Рушчыцаваю манераю пісаць. Справа менавіта ў *вычуваньнях*. У повязі абодвух мастакоў з тым атачэньнем, у якім яны стваралі...

Не зважаючы на невялікі памер гэтага халста Харашэвіча, гэта манумэнтальная рэч. Гэткі эфэкт дасягнуты маніпуляцыяй з прапорцыямі неба й зямлі. Неба заўсёды большае.... А таксама пералікам рознапамерных аб'ектаў: дрэвы, дамы, шпіц званіцы, высачэзная й танюткая антэна. Яны зьнітоўваюць па вэртыкалі неба й зямлю, на якой самы маленькі аб'ект — людзі...

Карціна «Пасьля навальніцы» напісана пастозна, шырокімі дэкаратыўнымі плямамі й пабудаваная ў цёплым калярыце. Асноўны вохрыста-умбрысты тон драматычна падкрэсьлены чырвонымі, нібы раскаленае вугольле, плямамі хмызоў на пярэднім пляне ды водсьветам на шатах дрэваў. Рэзкае, памежнае спалучэньне глыбокіх зялёных і чырванаватых фарбаў надаюць халсту вельмі драматычнае гучаньне, адпаведнае сюжэту. І толькі зіхоткі шпіц бажніцы ды сьцяна беленага дому, па якіх ужо сьлізгаюць наноў сонечныя прамяні, уносяць раўнавагу, нагадваючы пра скончэньне драмы. А лёгкія абрысы людзкіх постацяў, што наўмысна выбіваюцца з агульнага калярыту, зводзяць нас, нібы ў кіно, у наступны сюжэт...

Сяргей Харэўскі

твары, прадстаўленыя ў папярэдніх нумарах «НН»:

1 Фэрдынанд Рушчыц. **Зямля**
2 Мсьціслаў Дабужынскі. **Віцебск. Лесьвіца**
3 Марк Шагал. **Прамэнад**
4 Ільля Рэпін. **Беларус**
5 Марк Антокальскі. **Помнік Кацярыне**
6 Вітальд Бялыніцкі-Біруля. **Блакітная капліца**
7 Хаім Суцін. **Паж**
8 Казімер Малевіч. **Чорны квадрат**
9 Язэп Драздовіч. **Пагоня Ярылы**
10 Валянцін Волкаў. **Менск, 2 ліпеня 1943 году**
11 Манумэнт Перамогі
12 **Помнік Леніну ў Менску**
13 Пётра Сергіевіч. **Шляхам жыцьця**
14 Аляксей Глебаў. **Францішак Скарына**
15 Міхал Філіповіч. **Бітва на Нямізе**
16 Лявон Вітан-Дубейкаўскі. **Касьцёл Пятра і Паўла ў Дрысьвятах**
17 Лявон Тарасэвіч. **Бяз назвы**
18 Ян Булгак. **Выгляд з Зарэчча**
19 Іосіф Лянгбард. **Менская опэра**
20 Аркадзь Астаповіч. **Дворык**
21 Клаўдзі Дуж-Душэўскі. **Сьцяг**
22 **Прывакзальная плошча ў Менску**
23 Станіслаў Жукоўскі. **Інтэр'ер**
24 **Пакроўскі сабор у Баранавічах**
25 Міхал Станюта. **Партрэт дачкі**
26 Яўхім Мінін. **Успенскі сабор у Віцебску**
27 Ізраіль Басаў. **Успамін**
28 Віталь Цьвірка. **Ганча — партызанская зямля**
29 Леанід Шчамялёў. **Нацюрморт**
30 Міхал Рагалевіч. **Дзяўчына і ружы**
31 Уладзіслаў Стрэмінскі. **Сонца ў заплюшчаных вачах**
32 Барыс Казакоў. **Сьнежань**
33 Мікола Селяшчук. **Казачны калейдаскоп**
34 Міхал Сеўрук. **Жніво**
35 Уладзімер Кудрэвіч. **Раніца вясны**
36 Міхаіл Савіцкі. **Хлябы**
37 Гаўрыла Вашчанка. **Жнівень**
38 Аляксандар Кішчанка. **Чаканьне**
39 Алесь Пушкін. **Эпітафія дзеду**
40 Юры Герасіменка. **Партрэт Якуба Коласа**

слоўнік паняцьцяў

9. ПРА ЭТНІЧНУЮ ПРОТАМАСУ І ПАЛІТЫЧНУЮ НАЦЫЮ.

Валерка БУЛГАКАЎ

У датаваным 1942 годам вершы таленавітага беларускага паэта Алеся Салаўя «За славу Радзімы» маецца характэрны пасаж: «Нас дваццаць мільлёнаў! Сябе не дадзім мы у крыўду навале бандыцкай ліхой». Тут «дваццаць мільлёнаў» — колькасьць этнічных беларусаў на сваіх этнаграфічных землях.

Прайшло пяцьдзясят год, але мала што зьмянілася. І дагэтуль у сваіх разьліках, аналізах, плянах на будучыню зыходзяць з таго, што беларусы — дзесяцімільённы народ, які — дадаюць усё часьцей — жыве ў самым цэнтры Эўропы. З аднаго боку, усё гэта, безумоўна, адпавядае праўдзе. Але з другога боку, па-першае, культурныя і цывілізацыйныя, у адрозьненьне ад геаграфічных, межы Эўропы з Азіяй праходзяць не каля Екацярынбургу, а недзе тут, магчыма, крыху на захад ад Менску, і таму тэза пра цэнтральнаэўрапейскасьць Беларусі траціць усялякі сэнс. У аснове яе ляжыць чыста фармальны геаграфічны крытэр, не падмацаваны якімі-любя глыбейшымі чыньнікамі. Па-другое, ці сапраўды нас дзесяць мільёнаў?

Існаваньне нацыі пацьвярджаецца і вымяраецца ў тым ліку і выраблянным ёй культурным прадуктам, мэтанакіраваным тварэньнем культурных вартасьцяў. Пры гэтым ракурсе беларусы адназначна прайграюць сваім значна меншым паводле колькасьці суседзям — летувісам і латышам. Само сабой насоўваецца наступнае разрозьненьне:

беларусы як этнічная протамаса — лагодныя, рахманыя, спакойныя, ахвотна становяцца расейцамі, палякамі і ўкраінцамі, бесхрыбетныя, збольшага расейскамоўныя, асабліва ў маладзейшых пакаленьнях, задаволеныя, наколькі гэта магчыма, сваім жыцьцём і пануючым палітычным рэжымам, так ці інакш інтэграваныя ў сучаснае беларускае грамадзтва, заклапочаныя перадусім змаганьнем з будзённай руцінай і пошукам сродкаў на існаваньне, акурат пра іх ідзе гаворка, калі фігуруе лічба ў дзесяць мільёнаў;

беларусы як палітычная нацыя — няўрымсьлівыя, бескампрамісныя, апантаныя, зь істотным дамешкам чужой крыві, неспакойныя, часткова беларускамоўныя, угнеўленыя, з устойлівым комплексам адмаўленьня ўсяго таго, што ініцыюе сучасны «антыбеларускі беларускі» палітычны рэжым, пераважна неінтэграваныя ў санкцыянаваныя ім сацыяльныя інстытуцыі, прыцісканыя, уголас заявілі пра сваё існаваньне як палітычнай сілы цягам апошняга пятнаццацігодзьдзя, іх колькасьць прынамсі на парадак меншая за першую групу, што абумоўлівае іхную нязбытную слабасьць.

Ня трэба, аднак, думаць, што паміж гэтымі дзьвюма групамі існуюць вылучна антаганістычныя адносіны. Не, яны нагадваюць хутчэй сыстэму спалучаных судзінаў, і таму перацяканьне з адной групы ў другую аказваецца заканамерным і натуральным.

Алесь Салавей і яго пасьлядоўнікі паказваюць, наколькі глыбока ўкарэненая ў нас вера ў містыку лічбаў і калькуляцыяў і, адначасна, наколькі далёка заходзіць няўважнасьць і пагарда да нярэдка трагічнай рэальнасьці сёньняшняга дня. А гэтая рэальнасьць бязьлітасна сьцьвярджае, што ў цяперашняй Эўропе ўсе без вынятку этнічныя рухі да астачы здадзены ў музэй, а сама Эўропа Нацыяў на нашых вачох ператвараецца ў Нацыю Эўропу. ■

Сяргей ШЫДЛОЎСКІ

ШАРАЇ

навэля

Аматараў мэнтолавых гісторый зь любошчамі на эўраляндшафце варта папярэдзіць адразу — героі дадзенага аповеду, калі і бавяцца за бугром, дык толькі гандлюючы сьмятанай, і прыгажуні дараць ім часьцей пранцы, чым сваю любоў, і ў жылах іхных цячэ адно піва — цёмнае полацкае піва. Карацей, гэты яйцашчымлівы аповед напісаны для канкрэтных пацаноў, такіх, як мы з табой. І пачынаецца ён ab ovo — з Шарая.

Баяць, што Шарай дастаў у калёніі сухоты, — выглядаў ён сапраўды не жыльцом, калі я сустрэў яго апошнім разам у «Жар-птушцы». Кароль пятай мікрухі дужа апрасьціўся. Нейкая хлюндра, дакалупаўшыся не па справе, ела яго поедам, Шарай жа толькі пярхекаў ды мружыўся. Тут я прасёк — гамон нашай тусоўцы! І як у ваду глядзеў, — незабавам барбосы пачалі шчыміць шараёў на ўсіх цэнтравых танцпляцоўках Наваполацку. Аднойчы іхныя «старыя» падвалілі нават на родны шараёўскі дыскач у восьмай школе, каб паганяць малалетак. Што малалеткі, калі самога Шарая чмарыла на людзях нейкая бухая. У каго верыць пасьля гэтага зайцам прыгараднага дызэля «Полацак—Бігосава»? Палову зь іх зачапіў Аўган, а нехта і адседзеў, але яны дасюль, перабраўшы лішак, б'юць сябе ў грудак ды смарката кляношацца: «Мы бегалі за Шарая!» Даўся ён нам у знакі.

Каб піячыць піва на дывідэнды з гэтай сэнтымэнтальнасьці, ад яго патрабавалася толькі нейкая бадзюлька рэспэкту, але яму ўжо ўсё было да фені, — піўны крэдыт Шараю адкрыла сама сьмерць. Ён памёр акурат па нашай сустрэчы. Прынамсі, была такая дэза — і ёй веру, бо кароль здатны на многае, у тым ліку і на праўдзівую сьмерць.

Дзякуючы гэтай своечасовай кропцы, гісторыя шараёў набыла эфэктную завершанасьць навэлі — аповеду без маралітэ, але з рамантычнай фішкай. Для мяне ж яна і пачыналася як навэля — з пранізьліва прыгожых дэталяў. Памятаю свой першы бінт, якім я спавіваў далоні са сьвінчаткай, захліпваючыся трымцячай тугой, гэтак падобнай на млоснасьць адрынутага каханка, — усе мы заляцаліся тады да сьмерці. Я выбраў самы белы, і ён брыняў пакрысе брунатна-крывавым, як лякмус маіх заслуг перад шараямі.

Упершыню мяне прывёў да іх Лёня — у адрозьненьне ад большасьці шараёўскіх цэнтурыёнаў, ён быў не дзюдаістам, а вадналыжнікам, і да таго ж — габрэем, што сьведчыла ня гэтак аб нашай талеранцыі, колькі аб лёневым таленце ўстаўляць глузды пачынаючым антысэмітам.

Мы сябравалі зь пятай клясы. Нас было пяцёра, і апошнія парты заставаліся за намі аж да самага выпускнога, нягледзячы на паквапы суперных камандачак. Галоўнай нашай бавай былі карты. Калі мы гулялі не на грошы, Лёня папускаў сябе нават перамагаць. За свой аўтарытэт па драбязе ён не мітрэнжыўся, бо заўжды здольны быў на спор падцягнуцца трыцаць разоў. Без рыўкоў.

У пятай клясе Лёня валадарыў подумам хлопцаў нават больш, чымся зеленавокая Марынка, якая аднак узяла рэванш у нашых снах. Яна запанавала ў іх праз шаманства сваіх чырвоных ласінаў, што прывёз ёй бацька з альжырскай камандыроўкі. Яны адразу ж зрабіліся талісманам ейнай рана абуджанай жаноцкасьці. З хлапчуковай паловы клясу толькі Лёня зь ягонай паўднёвай крывёй здатны быў склясьці ёй канкурэнцыю ў аксэлерацыі, і ён ня схібіў, стаўшыся для нас на колькі гадоў стандартам мужнасьці. Апошнюю адзначыла і сама Марынка, якая паменавала яго аднойчы «быкам сьмярдзючым». Экспрэсія ейных словаў сказала майму раненаму сэрцу дужа многа, — я надыбаў нават іржавую штангу, цьвёрда пастанавіўшы зрабіцца калі і ня быкам, то казлом дык напэўна. Але ніякімі трэніроўкамі нерэальна было параўнацца зь Лёнем — клясыкам сярод адмарозкаў.

Значным этапам улёневым анабасісе была адлётная гісторыя зь іконкай, падзеі якой разгортваліся ў падшэфным калгасе — на тле азёрных краявідаў віцебскай западэнцыі. Мы папылілі туды неяк усім клясам на лён. Па прыезьдзе нашую сяброўскую пяцёрку падсялілі да самотнай бабулькі-каталічкі. Яна ўважала сябе полькай, што не замінала мне вучыцца ля яе беларускай мове. Толькі зрэдчас, згадаўшы неспадзевам пра сваю польскасьць, яна хапалася спраўджваць свой небагаты рэпэртуар касьцёльнай пальшчызны. Выявы Маткі Боскай траплялiся ў ейнай хаце гэтак жа густа ды недарэчы, як і кантралёры ў полацкіх аўтобусах. І вось аднойчы, абыходзячы пад ноч зь ліхтаром свае ўладаньні, нашая гаспадыня ўгледзела ў прорвіне ўласнай прыбіральні адну з гэных іконак — пакамечаную і загнюшаную.

Аб ейнай знаходцы зараз жа сталася вядома і нам. Толькі напачатку мы падумалі, што гэта надышоў канец сьвету. Ад таго нечалавечага «і-і-і», якое яшчэ ў прыбіральні пачала выводзіць нашая бабка, — аж шчыміла ў яйцах. На гэтым ультрагуку яна і ўплыла ў хату, трымаючы ў выпрастаных руках загнюшаную іконку. Покуль мы лыпалі вачыма, бабка насунулася на Лёню, нібы адразу ведала, скуль «гарыць». Але насуперак ейным чаканьням серны дым з праклятушчага піянэра-пагаліна не шугануў, і скрозь зямлю ён не праваліўся. Шараі траплялі і не ў такія калатнечы.

— Я вам новую на ксэраксе зраблю, — супакоіў цемрашалку Лёня, які адзіны захаваў мэлянхолію ў гэтай гамэрні. Але ўсё сапраўднае яшчэ толькі пачыналася — грознай вястункай кону ўжо трухала да нас на агеньчык куратарка практыкі, прыбраная ў мужніны споднікі. У яе было адмысловае чуцьцё на ЧП. Яна сама была добрым ЧП, але гэтым разам у пасіянарнай натуры куратаркі нешта перагарэла. Ад акрутнай расправы нас выратавалі, мусіць, ейныя кальсоны, якія зашкодзілі гэтай густоўнай тэатралцы закаціць нам сцэну па поўнай хворме. Хортам спыніўшыся на парозе, яна вомігам ацаніла сытуацыю ды, падсекшы бабку за прыпол, вывудзіла яе на двор. Справу загамавалі. Адзіным ейным наступкам была рулька гігіенічнай паперы, ахвяраванай нам самой куратаркай. Але і без выхаваўчых размоваў лёнеў прыкол нас уразіў. Мы амаль і не сьмяяліся нават — хіба самую крышку, каб толькі падтрымаць сябра. Але нашага спачуваньня ён не зацаніў. А і сапраўды — нічога кепскага ён не надумваў, сумленьня свайго не гвалтаваў і таму шчыра ня цяміў — скуль столькі зьвягі з-за мулкай паперыны.

Брутальная лёнева рэпутацыя склалася зь непаразуменьня. Калі ён прахадзіў аднойчы два тыдні зь зеленкаватай скулінай на носе, — Лёня не выкалываўся, як меркавалі мы. Яму элемэнтарна не хацелася, каб на твары ягоным было рабацінне ад выціснутых прышчоў. Ён меў паняцьці, быў па-свойму дабрамысным і ўжо напэўна — практычным. Пахібным было б высноўваць асаблівасьці ягонай натуры з нацыянальнасьці, як рабілі гэта за сьпінай шакалы. Лёня быў найперш шараём, а ўжо потым габрэем. Да таго ж ён зьяўляўся яшчэ й вадналыжнікам, а таму зачаста падаў. Праз гэта ён дастаў тры зрушэньні глуздоў, а чацьвёртае атрымаў у маёй прысутнасьці, калі мы каталіся ў лесе на лыжах. Лёня гайсануў з пагорку акурат на сасонку, не зрабіўшы аніводнай спробы адтэрмінаваць чацьвёртае зрушэньне. Часам і ў мяне здаралася нешта падобнае, — калі ты мкнеш на ровары з адхілу, то нейкае пачуцьцё, суроднае дурному сьмеху, змушае цябе падвярнуць не на масток, а ўзьвіцца арлёнкам па-над ручаінай, зацісnуўшы ровар паміж каленяў.

На гэтым мае падабенствы зь Лёнем і сканчаліся, — у астатнім ён быў непаўторным. Зрушэньне глуздоў удубальтавала ягоную маторнасьць, дадаўшы яму харызмы, а мэдычная даведка зрабіла яго мабільным, дазволіўшы сыходзіць са школьных заняткаў. Але апошнім ён ня злоўжываў, хоць у яго і здараліся моцныя мігрэні. У падобныя моманты з насяры ягонай кропаў пот, а позірк рабіўся шчымлівым, як у Жучкі. Калі хтосьці спрабаваў яму паспачуваць — Лёня адмахваўся локцем. Гэтак ён і падбіў вока адной спагадлівай практыкантцы-славесьніцы. А была яна прыгажуняй, дылі-дылі-дынь. Чарнявая і яркая. Роза Аляксееўна. Толькі вадзілі ёй трохі пяшчотныя лейтэнанцкія вусікі, а калі верыць Лёню, то і сьпіна ў яе была гэткай жа пушыстай. Толькі Лёня, мусіць, збрахаў. Быў гэты Леанід Юзэфавіч баальшы насьмешнік, — з тых, якія «гы-гы-гы». У Амэрыцы такіх ня любяць.

Але за ўдаваным цынізмам гэты хваравіты хлопчык хаваў добрае сэрца. Новая піянэрважатая ўмомант яго раскусіла:

— Вам ета не ідзёт, Лёня, — сказала яна, паставіўшы яго тварам да клясы.

— А каму цяпер лёгка, — азваўся ён, каб неяк падтрымаць душэўную размову.

Вось такі ён — Лёня — шараёўскі цэнтурыён. Па сканчэньні школы шляхі нашыя на колькі гадоў разышліся. Калі ж я вярнуўся пасьля вучобы дахаты — ужо з унівэрсытэцкім дыплёмам, у шараёўскіх нератах многае зьмянілася. Завітаўшы неяк да Лёні, я ўбачыў над ягоным мыйнікам каляровую выяву прадсядацеля з Гарадца. Як патлумачыў Лёня, шклоўская энэргетыка дужа дапамагала яму пры алькагольных атручэньнях. Маўляў, дастаткова толькі нахіліцца над тым мыйнікам, пакласьці два пальцы на глянды, гледзячы пры гэтым у чэсныя вочы прэзыдэнта, — і ўвесь вячорашні воцат зь цябе долу. Пасьля чаго можна прадэзынфікаваць страўнік новай порцыяй прэзыдэнцкай.

Лёня, мусіць, задужа гэтым злоўжываў, бо нягледзячы на ягоны статус вечнага студэнта, яму не далі давучыцца і перад самым выпускам адлічылі з полацкага «інсьціку». Намёк лёсу ён зразумеў правільна і ўборзьдзе зьехаў на гістарычную радзіму.

Няма цяпер каму займацца інтэрнацыянальным выхаваньнем шараёў. Мы падрасьлі — узбуйнеў і наш страх, які змушаў нас колісь зьбівацца ў граі. Мы і зараз паасобку ня ходзім, — частка шараёў паказачылася пад ачолай нейкага атамана з патомных школьных ваенрукоў, нехта з найбольш пасіянарных ваюе зь мянтамі Лукі на менскіх праспэктах, а хтосьці — з самых практычных — атабарыўся з «брыгадай» на трасе «Масква—Берасьце». Часам за кухлем цёмнага мы спатыкаемся ў півярні і тады любім спамянуць, як нам бегалася за Шараём. Гэтыя згадкі — мо апошняе, што нас цяпер зьвязвае. Але хіба гэта замала — адна на ўсіх баёвая маладосьць, унесьмярочаная Шараём, які сваёй сьмерцяй сьмерць зьняхаіў, уваскросшы на новае жыцьцё ў нашых бяседных показках.

■

Адам ГЛЁБУС

РАСЕЙСКАЯ КАЛЕКЦЫЯ-2

Нататкі з «Кішэннай гісторыі культуры»

МАЛЕВІЧ

Калі што й прызнаецца ў сьвеце з расейскага выяўленчага мастацтва, дык гэта авангард дзясятых — пачатку трыцатых гадоў XX стагодзьдзя. Палотны Кандзінскага, Татліна, Родчанкі выстаўленыя ў найлепшых галерэях сьвету. Яны бясспрэчна вартыя самага пільнага вывучэньня, найгрунтоўнейшых дасьледаваньняў і ўрачыстых шанаваньняў. Расейскі рэвалюцыйны авангард канцэнтруецца ў адной найвыбітнейшай асобе Казіміра Малевіча. Чытаючы ягоныя лісты, я знайшоў той факт, што Малевіч, перапраўіўшы большасьць сваіх твораў у Нямеччыну, прасіў напрамілы Бог не вяртаць іх у Расею. Таму робіцца зразумелым, чаму найлепшы збор твораў супрэматыста Малевіча знаходзіцца ў Галяндыі. Казімір Малевіч быў празорцам. Ня верыў, што ў Расеі ўсталюецца цывілізаванае грамадзтва. Лізаблюды, што яшчэ ўчора вылізвалі партрэцікі цароў, пачалі старанна вылізваць морды ленінаў, варашылавых і сталінаў. Традыцыя працягваецца: учорашнія атэісты малююць царкоўныя абразы. У адрозьненьне ад бесхрыбетных хамэлеонаў, Малевіч быў наскрозь ідэалягізаваны адной вялікай ідэяю абнаўленьня сьвету, а сьвет Расеі застаўся нязьменны — ні чорны, ні белы, ні чырвоны, а балотнага колеру.

КУПРЫН

Расейскі бэлетрыст Аляксандар Купрын, якога ніяк не папракнеш у суб'ектыўнасьці ці нелюбові да Расеі, у нарысе «Крышку Фінляндыі» апісвае карціну ў найсапраўднейшым расейскім жанры: «Памятаю, гадоў пяць таму мне давялося зь пісьменьнікамі Буніным і Фёдаравым прыехаць на адзін дзень у Іматру. Назад мы вярталіся позна ўночы. Аб адзінаццатай цягнік спыніўся на станцыі Антрэа, і мы выйшлі перакусіць (далей Купрын апісвае фінскія прысмакі і тое, што расейскія сэрцы былі агаломшаны ежаю. — *А.Г.*).

А калі мы вярталіся ў вагон, нас чакала цудоўная карцінка ў сапраўды расейскім жанры.

Справа ў тым, што з намі ехалі два падрадчыкі па каменных работах. Усім вядомы гэты тып кулака зь Мішчэўскага ўезду Калускай губэрні: шырокая, сальная, скуластая чырвоная морда, рыжыя валасы, што віюцца з-пад картуза, рэдзенькая барадзёнка, лядачы погляд, вера ў Бога на пяціалтынны, гарачы патрыятызм і нянавісьць да ўсяго нерасейскага — адным словам, добра знаёмы сапраўды расейскі твар.

Трэ было паслухаць, як яны зьдзекваліся зь бедных фінаў!

— Вось дурні дык дурні. Бо такія балваны, чорт іх ведае! Ды я, калі падлічыць, на тры рублі і сем грывен зьеў у іх, у шэльмаў... (а плаціў за швэдзкі стол толькі адзін рубель з драбязой. — А.Г.) Эх, навалач! Мала іх б'юць, сукіных сыноў! Адно слова — чухонцы.

А другі падхапіў, душачыся ад сьмеху:

— А я... знарок шклянку кокнуў, а потым узяў і ў рыбіну плюнуў...

— Так іх і трэба, свалату!»

У гэтай сапраўды расейскай карціне больш за ўсё мяне засмучае тое, што апляваную рыбіну зьелі Купрын з Буніным і Фёдаравым.

ШОЛАХАЎ

Выдатны нігіліст Люі-Фэрдынанд Сэлін у сваім рамане «З замку ў замак» абурыўся: «...Вось калі б я быў які-небудзь Влас... Влас Прохрохроффф... з Крыжопалю-на-Доне... Крыжопаль-на-Доне — гэта вам не Курбвуа-на-Сэне!.. вось тады Нобэлеўская прэмія была б у мяне ў кішэні... Але ж я тутэйшы і навет ня сэфард!.. Такія, як я, нікому не патрэбныя!.. Іх трэба зьніштажаць!.. Каб не назалялі!..» Абураўся Сэлін. І меў права, бо Шолахаў, Салжаніцын — Власы Прох-рох-рохарафы горшыя за яго, а ўзнагароды атрымалі. Шолахаў атрымаў за антыінтэлектуальны, грувасткі і нечытэльны раман пра Дон. Шолахаў і Ленінскую прэмію атрымаў, і Сталінскую — «яму пашанцавала нарадзіцца ў Крыжопалі».

■

УСПАМІНЫ ПРА ШКЛОЎСКУЮ РАЁНКУ

Паўлава В. Шклоўскія страсьці. Масква. «Полином», 1999. 128 с.
ISBN 5-87081-002-3

Былая шклоўская журналістка Вольга Паўлава да заканчэньня прэзыдэнцтва свайго земляка выдала мастацка-дакумэнтальную кнігу ўспамінаў пра ўласную працу ў мясцовай раёнцы. Зрэшты, твор прысьвечаны ня столькі журналісцкай працы, колькі асобе і прыватнаму жыцьцю першага прэзыдэнта РБ. Ня ведаю, ці спадабаецца галоўнаму герою гэты твор, я ж праглынуў яго літаральна за пару гадзінаў, што называецца, на адным дыханьні.

Хоць назва мяне спачатку крыху напалохала — ніколі не любіў чытва пра закуліснае жыцьцё моцных гэтага сьвету. Ні былых, ні сёньняшніх. Пабачыўшы назву, нават хмыкнуў — ну вось, «лукашэнкіяна» паболела на адзін твор: у дадатак да кінэматаграфічнага зьявіўся й літаратурны. Але зь першых старонак я ўцягнуўся ў гісторыю жаночага захапленьня й расчараваньня.

Напісаная яна ў форме дакумэнтальных занатовак, багатаю на эмоцыі ды пачуцьці моваю. Умела складзеная зь невялікіх аповедаў-карцінак, што з кранікальнай дакладнасьцю вяртаюць чытача ва ўсходнебеларускае мястэчка пачатку й сярэдзіны 90-х. Дзе аднойчы, мала вядомы ў краіне, але добра вядомы на Шклоўшчыне дырэктар саўгасу «Гарадзец» Аляксандар Лукашэнка «пабіў мясцовага трактарыста Васіля Бандарукова па мянушцы Муркін. Дзе малады міліцыянт Уладзімер Канаплёў «палічыў за лепшае разьвітацца зь міліцэйскай формай і перайсьці працаваць выкладчыкам у спэцшколу». Дзе дырэктар дзіцячага садка вёскі Рыжкавічы Галіна Радзівонаўна (Лукашэнка — калі хто ня ведае) увечары дапамагае адзінай выхавацельцы і не дае разводу гуляку-мужу. Дзе вядомыя нам героі яшчэ жывуць сваімі няхітрымі клопатамі і мала хто думае пра дзень заўтрашні. Дзень, які крута зьменіць спачатку іх жыцьцё, затым жыцьцё ўсёй краіны. Дзе з суплёту чалавечай подласьці, баязьлівасьці ды дурасьці мястачковага маштабу няўмольна паўстаюць абрысы «фэномэну Лукашэнкі». І дзе галоўны герой аповеду — зусім не галоўны, а такі ж самы, дробны і ўбогі статыст, зьбегам акалічнасьцяў выкінуты на авансцэну. І яго-ная незайздросная роля, здаецца, пачынае ўжо палохаць не яго аднаго.

Дзіўна — пад час чытаньня мяне чамусьці не пакідала адчуваньне, што галоўныя героі гэтае кніжкі так і не пакінулі свайго месца дзеяньня — гораду Шклову. Быццам сёньня ня іхнымі галасамі гавораць нашыя радыё і тэлебачаньне. Можа, гэта ад таго, што лёс пэрсанажаў лёгка ўгадваецца ў яшчэ не напісаных разьдзелах з заведама сумным эпілёгам?

Зьміцер Бартосік

«ARCHE» ПРА ВАЙНУ



Новы нумар часопіса «ARCHE» піша пра вайну. Найперш мы хацелі рэканструяваць «*настрой часу*». Мы адшуквалі тэксты, якіх ня ведаем, пра вайну, якой таксама ня ведаем — бо яе нам засланіў міт пра яе. Тэксты пра забабонныя думкі. Пра нацыянальныя ілюзіі людзей, якім выпала паспытаць чарговага чужынскага парадку. Пра закулісныя хаўрусы. Пра авантурныя ідэі. Пра імпэтныя прысяганьні. Пра кроў і варагоў, і сваіх — на вайне заўжды, як на вайне. Пра вайну, якая загасіла апошнія ілюзіі для Беларусі, канчаткова пакінуўшы яе на Ўсходзе... Зьбіваючы заржавелыя замкі накінутых абмежаваньняў, мы ўзнаўляем факты і дапаўняем палітру. Мы шукаем *спод* тэмы, блізкай кожнаму з маленства — *вялікая айчынная вайна*.

Юрась Бушлякоў

Сярод тэкстаў нумару: «Трывога» С.Юстапчыка (Антона Адамовіча), «Зь дзёньніка Ів.Ів.Чужанінава» Л.Крывічаніна (Л.Савёнка), «Страшны год» Юр.Монвіда (Ф.Аляхновіча), «Вацлаў Іваноўскі і беларускае адраджэньне» Юр'я Туронка, успаміны беларускага гісторыка Ўладзімера Ісаенкі, які перажыў штурм Бэрліну ў самым цэнтры нямецкай сталіцы, апавяданьні Вячаслава Адамчыка «Леанарда» і Валеркі Булгакава «Правільны выбар», прыпавесьць альбанскага пісьменьніка Ісмаіла Кадарэ «Плач па Косаве» і артыкул «Расейскія прэтэнзіі на рускую спадчыну» прафэсара Гарвардзкага ўнівэрсытэту Эдварда Кінана ў рубрыцы «Гуманістыка», лірыка Чэслава Мілаша, Зьмітра Саўкі і Андрэя Хадановіча, эсэ Цьветана Тодарава.

Даведацца можна праз тэл.: 257 48 69 або 249 08 88.
Пытайцеся у кнігарнях і кіёсках «Белсаюздруку».

«БАЛТО»,«АЛІСА Ў КРАІНЕ ЦУДАЎ», «ПРЫГАЖУНЯ Ў СОННЫМ ЛЕСЕ» — мультыплікацыйныя фільмы, дубляваныя па-беларуску акторамі вядучых менскіх тэатраў.

«Ехаў казачнік Бай», «Цік-так ходзікі», «Беларускія народныя казкі», «Стойкі алавянны салдацік + Каліф-бусел» — аўдыёкасэты з запісамі казак, калыханак, песьняў для маленькіх беларусаў.

Кошт відэакасэты — 800 тыс. руб., кошт аўдыёкасэты — 300 тыс. руб.

Касэты можна атрымаць, пералічыўшы грошы звычайным паштовым пераказам на рахунак: ЗАТ «Сотвар» р/р 2120000000541 у філіі 506 ААБ «Беларусбанк», код 809. У графе «Для пісьмовага паведамленьня» напішыце, якую касэту Вы замаўляеце. Менчукі! Зьвяртайцеся на тэл. 8 (017) 228-45-88.

НАША НІВА КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. 220050, Менск, а/с 537

Тэкст _____

_____

Імя і прозьвішча _____

Адрас, тэлефон _____



НАША НІВА 90 ГАДОЎ ТАМУ

АБ УСІМ ПАТРОХУ

23 ліпеня 1909 году.

У №20 «Н.Н.» пісалася аб машынах да лётаньня ў паветры (аэрастатах), якіх цяпер шмат будуюць заграніцай. Вось, цяпер прыйшла вестачка, што адзін беларус з Гродзенск. губ. — сын простага вясковага мужыка Гаўрыла Геляшчук, быўшы каваль, зрабіў таксама машыну да лётаньня. Геляшчук чацьвёрты год, як служыў у графа К. у Пазнані (Нямеччыне) і там прызнаўся графу ў сваіх думках; той зацікавіўся і стаў чым мага памагаць Гаўрыле. Работа ішла, але ўсё гэта пад вялікім сэкрэтам; толькі нядаўна Геляшчук перад велізарнай грамадой народу першы раз з сваім памошнікам — паляком — хлапцом 17 год — узьляцеў на паветра. Машынай сваей ён кіраваў, як сам хацеў — і ўзад, і ўперад, і ў кругі. ■

прыватныя абвесткі

Падгол Уладзь, Стэфановіч Валянцін і Бяляцкі Алесь! Вялікі Дзякуй! За юрыдычную й маральную падтрымку пад час судзілішча 22 ліпеня. Хлопцы з Малінаўкі-7

Мяняю расейска-ангельскі слоўнік 55 тыс. словаў б/в у добрым стане на аналягічны нямецка-расейскі. Тэл.: 256-04-10

Куплю кнігі з сэрыі «Беларускі кнігазбор», акрамя: «Філаматы і філарэты», «К.Каліноўскі». Тэл.: 243-39-05, Алег

Сям'я здае аднапакаёвую кватэру. Тэл.: 230-05-34

Шукаю грошы для паездкі на навуковую канфэрэнцыю. Тэл.: (0232) 57-87-37. Мікола

Дарагая Аліцыя! Вельмі чакаю ад цябе ліста, я ўжо ссумавалася, шмат навінаў. Твая Дар'юшачка

Сапраўднага беларуса, любага мужа віншую з днём нараджэньня. Іна

Сябры! Здаю кватэру аднапакаёвую з тэлефонам, у цэнтры. Тэл.: 230-05-34. Сарока (Леаніда)

Міхал зь Віцебску! Я паступіла на журфак БДУ й цяпер упарта чакаю вестачку ад цябе! Тацяна

Хлопец (23) шукае працу да 50$. Любыя прапановы. 220073, а/с 187, Менск

Куплю слоўнікі Насовіча, Станкевіча, беларускую Біблію. Тэл.: 226-42-63

Ці ж чалавек ён? Азіят, Душа зацятая, ліхая, Такіх паноў і сьвет ня знае. Ды хоць бы пан, а то — зараза, Так, шалахтун, байструк, пралаза, Няшчасны выradак, пастух... А колькі гонару і мух! Якуб Колас

Намэнклятура, нятворчая інтэлігенцыя — цалкам залежная ад дзяржавы, корміцца ад яе. Таму і жадае моцнай рукі. Пры рынку ж яна згіне. Вячаслаў Мілкоўскі

Рэжым даказаў на справе, што ён нічога ня ўмее ні вырашаць, ні рабіць. Гэта — яшчэ адно пакаленьне бальшавікоў. Добра, каб апошняе. Вячаслаў Мілкоўскі

Дэмакратыя патрэбна народу, а ня ўладам. Яны заўсёды па прыродзе манархістыя. Вячаслаў Мілкоўскі

Дай волю ўладару, дык ён застанецца пажыцьцёва, бо сумленьня ня мае. Таму й прыдумана дэмакратычная, падкантрольная народу форма ўлады. Вячаслаў Мілкоўскі

Сп. Мілкоўскаму: «Йдзе дух Спадароў, там свабода» 2 Карынц. 3:17.

Прыхільнікі ВКЛ ды манархіі нашага ладу, яднайцеся! Жыве ВКЛ! А/с 124, 246012, Гомель, ВКЛ

Запрашаем ліцьвінаў да згуртаваньня. А/с 124, 246012, Гомель

Прапануем в/а працу ў хаце (250 у.а.). Гэта Вы можаце! Укладзіце 2 капэрты (адну з зв/а) і купон б/а: 220089, Менск-89, а/с 122

Прадстаўлю Вашыя інтарэсы ў Менску. 220073, Менск, а/с 187

Хлопец (23) шукае працу ад 50$ да 300$. 220073, Менск-73, а/с 187

21-га ліпеня выйшаў новы (сёмы) нумар газэты «Радавая Беларусь», орган Народнага Сакратарыяту БНР. Замаўляйце: а/с 169, 220030, Менск. Кошт 20.000 руб.

Выйшаў №1 газэты маладых літаратараў «Наша ніва ісьцінная». Выданьне несур'ёзнае з постмадэрновым смакам. Пакаштуйце гэты фрукт — дашлеце капэрту з маркаю й купон б/а: а/с 169, 220030, Менск

Мы друкуем таксама абвесткі большым шрыфтам за невялікую плату:
— да 20 словаў — 40 000 руб., звыш 20 словаў — 60 000 руб.;
— па-мастацку аформленая аб'ява (мінімальны памер рэклямнага модулю 18 кв. см) — 180 000 руб.;
— па-мастацку аформленая аб'ява памерам больш за 24 кв. см з улікам кошту арыгінал-макету — ад 25 000 руб. за 1 кв. см.
За аб'яву пра сямейныя падзеі — зьніжка.

Каб замовіць платную прыватную абвестку, трэба пералічыць грошы праз пошту пераводам на наступны разьліковы рахунак: *Рэдакцыя газэты «Наша Ніва», р/р 3012213050010 Ленінскае аддз. «Белбізнэсбанку» г.Менску, код 763.*

На зваротным баку бланку паштовага пераводу ў сэктары «Для пісьмовых паведамленьняў» запісваецца дакладна і чытэльна тэкст абвесткі, тэлефон для сувязі і АБАВЯЗКОВА ДАДАЕЦЦА СКАЗ: «ЗА РЭКЛЯМНЫЯ ПАСЛУГІ». *Рэдакцыя*

3-га ЖНІЎНЯ А 19-Й ГАДЗІНЕ
(Камуністычная, 86)
МАСТАЦКАЯ СФЭРА «ВУЛЕЙ» ПРЭЗЭНТУЕ: Аляксей ДАЙЛІДАЎ, Яўген ЛУКАШЭВІЧ, Антон ТАРАС у музычна-паэтычным дзеяньні **«МАХА — МАНТРА».** Псыхадэлія... Шэпт музыкі. Колер сну. Змываньне межаў. Як было ў старадаўнія часы. Чакаем!
Уваход вольны

паштовая скрынка

Міколу С. зь Менску. *Не пералічайце, што Вы зрабілі для людзей. Пералічайце, чаго Вы яшчэ не зрабілі.*

«Іду праспэктам ля ўнівэрсаму «Цэнтральны». Насустрач мне міністар аховы здароўя Зелянкевіч, унушальны, у блакітным гарнітуры, з гальштучкам, і смокча кока-колу з макдональдзаўскага пластыка праз саломінку — значыць, няма небясьпекі ў заакіянскім напоі!» — а раптам гэта быў не сп. Зелянкевіч?

Жыхарам пасёлку Замір'е Ельскага раёну. *Пішаце, што «такія беззаконьні, ствараецца ўражаньне, робяцца ва ўсёй рэспубліцы» і «пісьмо такога ж зьместу адпраўлена ў прэзыдэнцкую камісію», але «падпісацца зь вядомых прычынаў не рызыкуем, бо калі гэтае беззаконьне возьме верх, нам тут усім стане цесна». Ну, у нас тут у Менску людзі баяцца, што іх зь міністэрстваў і сынэкураў пазвальняюць, а Вас куды ўжо тое «цесна» парэсьне?* ■

«Наша Ніва» незалежная газэта, заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991. Галоўны рэдактар Сяргей Дубавец. Рэдактар выпуску Андрэй Дынько. Мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі. Адказны сакратар Аляксандра Макавік. Дызайн-макет Лявон Раманчык. Набор Насты Дзядзенкі. Выдавец: рэдакцыя газэты «Наша Ніва». Заснавальнік Павал Жук. Адрас для допісаў: 220050, Менск, а/с 537.
Tel/fax: (017) 227-78-92. E-mail: niva@user.unibel.by Http://members.xoom.com/Nasa_Niva.

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. Наклад 2792. 6 палос фарматам А2. Нумар падпісаны ў друк 18[05], 1.08.1999. Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова № 3898. Кошт свабодны.
Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня N 581 ад 4-га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам па друку Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, пр. газэты «Известия», д. 8, кв. 173.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12